Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

30 ЖНІЎНЯ 2016 г. АЎТОРАК № 166 (28276)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Падпісаны ўказ аб субсідыях на «камуналку»**

СТАР. 2



**Рагачоўскія мясціны Андрэя Макаёнка**

СТАР. 4



**Чаго чакаць ад трэцяй эканомікі планеты?**

СТАР. 13

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Наталля КАЧАНАВА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Матэрыяльнае і маральнае стымуляванне нашых педагагічных кадраў — такая задача была пастаўлена кіраўніком дзяржавы. Вызначаны тэрмін да 1 верасня, каб унесці прапановы. Па адной з іх ужо падрыхтавана пастанова ўрада. Кваліфікацыйная катэгорыя педагогаў, якія аказваюць дадатковыя паслугі, будзе ўлічвацца пры іх аплаце. Думаю, гэта будзе пэўным стымулам для педагогаў у дадатковай адукацыі. Што тычыцца іншых матэрыяльных стымулаў, то цяпер гэтыя пытанні разглядаюцца ва ўрадзе, і ў найбліжэйшы час прапановы будуць прадстаўлены кіраўніку дзяржавы».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 30.08.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9574 | ▲ |
| Еўра | 2,1897 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0300 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0767 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Да школы гатовы?



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Першакласніку з вёскі Заазер'е Пухавіцкага раёна Антону ЗЫЛЮ ў сталічным універмагу «Беларусь» прадавец аддзела школьных тавараў Валерыя Урублеўская дапамагае падабраць касцюм на яго першую ўрачыстую школьную лінейку.

■ Класныя навіны

## ПІЯР-ТЭХНАЛОГІІ ДЛЯ ПРАФЕСІІ НАСТАЎНІКА

### Кіраўнік сталічнай сістэмы адукацыі — пра інклюзію, партфоліа і выхаванне бацькоў

**Штогод у сістэму адукацыі сталіцы ўліваюцца ад 500 да 700 маладых спецыялістаў. Але праблема іх замацавання на першым працоўным месце па-ранейшаму актуальная. Няхай яна і не стаіць так востра, як яшчэ тры-чатыры гады таму, тым не менш далёка не ўсе выпускнікі педагагічных спецыяльнасцяў звязваюць сваю будучыню са школай. Некаторыя атрымліваюць вышэйшую адукацыю па іншым профілі. Нехта спрабуе пасля заканчэння адпрацоўкі па размеркаванні самарэалізавацца ў тых сферах, дзе плацяць больш, дзе працоўны дзень строга рэгламентаваны, а выхадныя дні можна прысвяціць уласнай сям'і...**

**Узнімалася кадравая праблема і на жнівеньскім педагагічным форуме «Сталічная адукацыя. Стратэгіі развіцця», які сабраў больш як 500 удзельнікаў.**

### КАЛЕДЖ І ПЕДАГАГІЧНЫЯ КЛАСЫ

— Мы лічым настаўніка носьбітам ведаў і духоўных каштоўнасцяў, але давайце прызнаемся: сёння ў школу прыходзіць зусім іншае пакаленне педагогаў, і некаторых з іх даводзіцца вучыць прафесійным ідэалам і адказнасці за тое, з чым яны ідуць у клас да дзяцей, — падзяліўся сваімі думкамі з удзельнікамі форуму **старшыня Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Міхаіл МІРОНЧЫК.** — Мне здаецца, што не ўсе пытанні патрабуюць фінансавых уліванняў. Кожны педагог сваімі асобаснымі і прафесійнымі якасцямі фарміруе і свой аўтарытэт, і стаўленне грамадства. Наша задача яму ў гэтым дапамагчы, а для гэтага ў сферу адукацыі павінны прыйсці піяр-тэхналогіі і тэхналогіі праектавання іміджу, якія спрацуюць на павышэнне статусу педагога.

СТАР. 6

■ Рэпарцёр атрымаў заданне...

## ПРАВЕСЦІ АДЗІН ДЗЕНЬ З РАБОТНІКАМІ «МІНСКЗЕЛЯНБУД»

**Гэтае прадпрыемства з'яўляецца найбуйнейшай у рэспубліцы структурай, якая займаецца азеляненнем і добраўпарадкаваннем тэрыторый. І займаецца паспяхова: чысціня і дагледжанасць горада — адна з візітных картак сталіцы. Што ўваходзіць у штодзённыя абавязкі рабочых «Мінскзеленбуда», чым іх прываблівае гэтая праца і якія каментарыі яны часцей за ўсё чуюць, мы даведаліся, на дзень стаўшы часткай адной з брыгад.**

У той час, калі большасць жыхароў сталіцы нетаропка вылазіць са сваіх цёплых ложкаў, работнікі «Мінскзеленбуда» ўжо бяруцца за работу. У 7 гадзін раніцы — агульны сход з майстрам, падчас якога ўсе атрымліваюць заданні на першую палову дня. Аднак пачынаецца праца заўсёды з аднаго і таго ж — прыборкі. Гледзячы на акуратныя скверы і чыстыя паркі, цяжка паверыць, што зранку яны больш нагадваюць сметнікі. Раскіданыя па ўсёй тэрыторыі недакуркі, пустыя бутэлькі, пакеты, фанцікі, часам — выламаныя лаўкі і разбітыя скрыні для смецця. Як толькі надыходзіць ноч, на горад нібы апускаецца разбуральная сіла.

СТАР. 12



# «КАМУНАЛЬНАЯ» ДАПАМОГА

Прэзідэнт падпісаў Указ «Аб прадастаўленні безнаяўных жыллёвых субсідый»

**Дакументам прадугледжваецца ўкараненне з 1 кастрычніка 2016 года сістэмы безнаяўных жыллёвых субсідый на аснове выяўляльнага і заяўнага прынцыпаў, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Гэтая мера неабходна для забеспячэння дзяржаўнай падтрымкі ў першую чаргу асоб пенсійнага ўзросту і сацыяльна неабароненых катэгорый грамадзян ва ўмовах росту ўзроўню кампенсацыі насельніцтвам затрат на аказанне жыллёва-камунальных паслуг.**

Субсідыі будуць прадастаўляцца ў выпадку, калі штомесячная сума платы за жыллёва-камунальныя паслугі ў межах устаноўленых нормаў спажывання гэтых паслуг і сума кампенсацыі выдаткаў на электраэнергію, спажытую на асвятленне дапаможных памяшканняў і работу абсталявання ў шматкватэрным жылым доме, перавышае 20% сярэднямесячнага сукупнага даходу сям'і, якая пражывае ў горадзе, і 15% — у сельскім населеным пункце.

Указам прадугледжваецца, што пералік даходаў уласніка жылога памяшкання, наймальніка жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду, удзельніка арганізацыі забудоўшчыкаў і членаў яго сям'і, якія пражываюць сумесна з ім і ўдзельнічаюць у вызначэнні сукупнага даходу, для прадастаўлення безнаяўных жыллёвых субсідый будзе вызначаны ўрадам.

Укараненне сістэмы налічэння субсідый на аснове выяўляльнага прынцыпу будзе ажыццёўлена з 1 кастрычніка 2016 года непрацуючым пенсіянерам і непрацуючым інвалідам.

Грамадзянам, не ахопленым сістэмай выяўляльнага прынцыпу, прадастаўленне субсідый будзе ажыццяўляцца таксама з 1 кастрычніка 2016 года на аснове заяўнага прынцыпу.

Пры гэтым ураду даручаецца прааналізаваць эфектыўнасць прадастаўлення безнаяўных жыллёвых субсідый па выяўляльным прынцыпе і ўнесці ў вызначаным парадку на разгляд Прэзідэнта прапановы аб магчымым пашырэнні катэгорый грамадзян, якім безнаяўныя жыллёвыя субсідыі прадастаўляюцца па выяўляльным прынцыпе.

Указам таксама зацверджаны парадак прадастаўлення субсідый.

# ДОБРЫЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ

Беларусь і Кітай сталі стратэгічнымі партнёрамі і працягваюць рухацца далей

**Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў на сустрэчы з дэлегацыяй Народнага ўрада правінцыі Хунань (КНР) на чале з мэрам урада цэнтральнага горада Чанша Ху Хэнхуа і прэзідэнтам кампаніі Zoomlion Чжань Чуньсінем.**

«Нашы краіны і народы звязваюць шчырае сяброўства і плённае супрацоўніцтва ў розных сферах дзейнасці. За 25 гадоў з моманту ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Беларуссю і Кітаем пройдзены вялікі шлях насустрач адно аднаму. Паміж намі няма закрытых тэм», — заявіў Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, вялікую ролю ў гэтым працэсе іграюць цесныя міжрэгіянальныя сувязі, што пацвярджаецца прыбыццём дэлегацыі з правінцыі Хунань у Беларусь. «Ваш цяперашні візіт носіць асаблівы характар. Ён праходзіць напярэдадні запланаванай на верасень нашай сустрэчы на вышэйшым узроўні са Старшынёй КНР спадаром Сі Цзіньпінам. Гэтыя перамовы павінны пакласці пачатак якасна новага этапу кітайска-беларускага партнёрства — рэалізацыі поўнамаштабных інвестыцыйных праектаў», — цытуе кіраўніка дзяржавы прэс-служба Прэзідэнта.

Аляксандр Лукашэнка прывёў у якасці прыкладу паспяховага супрацоўніцтва правінцыі Хунань і рэгіёнаў нашай краіны стварэнне доследных узораў будаўнічай і камунальнай тэхнікі буйной кітайскай кампаніі Zoomlion на базе шасі МАЗ.

Пачата рэалізацыя сумесных праектаў з удзелам Мінскага трактарнага завода і «Гомсельмаша» па пашырэнні мадэльнага шэрагу вырабаў як для еўрапейскага, так і азіяцкага рынкаў, у тым ліку самога Кітая.

«У Магілёўскай вобласці ёсць прамысловы патэнцыял, які можна рэалізаваць з прыцягненнем вядучых прадпрыемстваў правінцыі Хунань, тым самым пашырыўшы вашу прысутнасць у краінах Еўразійскага саюза і Еўропы. І пры гэтым мы гарантуем кітайскім кампаніям максімальна спрыяльныя ўмовы гаспадарання», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

У сваю чаргу Ху Хэнхуа падкрэсліў, што паміж Беларуссю і Кітаем неабходна развіваць міжрэгіянальнае супрацоўніцтва, і дзейнасць кампаніі Zoomlion таму спрые.

У цэлым кітайскі бок на сустрэчы адзначыў добрыя перспектывы для развіцця ўзаемадзеяння і гатоўнасць інвеставаць у Беларусь. У ліку прыярытэтных партнёраў, з якімі планеецца развіваць супрацоўніцтва, — МАЗ, МТЗ, «Гомсельмаш», «Строммашына». Пры гэтым разглядаецца магчымасць стварэння сумеснага інжынернага цэнтра.

## ■ Парламенцкі дзённік

# НАРАДА ПАРЛАМЕНТАЎ

**У Варшаве праходзіць сустрэча спікераў парламентаў дзяржаў Цэнтральна-Усходняй Еўропы. Нашу краіну прадстаўляе намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Віктар ГУМІНСКІ.**

Як паведамляе прэс-служба ніжняй палаты, віцэ-спікер Палаты прадстаўнікоў будзе прымаць удзел у мерапрыемстве з 30 жніўня да 1 верасня.

«Мерапрыемства будзе накіравана на абмеркаванне пытанняў супрацоўніцтва паміж краінамі рэгіёна, — інфармуе прэс-служба. — Віктар Гумінскі выступіць падчас дыскусій, а таксама правядзе двухбаковыя сустрэчы з замежнымі парламентарыямі. Чакаецца, што ў сустрэчы прымуць удзел кіраўнікі парламентаў шэрагу дзяржаў Цэнтральна-Усходняй Еўропы».

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

# Аналітыкі для палітыкі

**Клуб, які будзе аб'ядноўваць экспертаў з усёй краіны, можа з'явіцца ў найбліжэйшы час**

**Базай для яго стане праект БРСМ «Адкрыты дыялог». З такой ініцыятывай выступіў першы сакратар ЦК БРСМ Андрэй БЕЛЯКОЎ на рэспубліканскім спартыўным фестывалі для працоўнай моладзі «Алімпія-2016».**




Фота БЕЛТА.

У дыскусіі на тэму «Моладзь і палітыка: формула адказнасці» прынялі ўдзел міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар БУЗОЎСКІ, старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія ЯРМОШЫНА.

Клуб, які плануецца зрабіць, будзе збіраць прафесіяналаў для абмеркавання найбольш актуальных пытанняў. Ігар Бузоўскі падтрымаў гэтую ідэю. Ён адзначыў, што такая пляцоўка будзе стымуляваць людзей да пастаяннага ўдзелу ў жыцці грамадства. Прычым ёсць сэнс запрашаць не толькі членаў БРСМ, але і старэйшых экспертаў, якія ўжо выйшлі з маладога ўзросту.

— Адназначна будзем падтрымліваць гэтую ініцыятыву, — заявіў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Бузоўскі. — Калі ўсё атрымаецца, гэта будзе той праект, які сёння патрэбен краіне, грамадзянскай супольнасці, інтэлектуальным колам. Таму давайце якасна прадумаем гэтую ініцыятыву, каб яна працавала і як узровень адпавядаў той высокай задачы, якую вы перад сабой ставіце.

Акрамя гэтага, на «Адкрытым дыялогу» Ігар Бузоўскі адзначыў, што кандыдаты ў дэпутаты павінны імкнуцца да прафесіянальнага росту. Гэта таксама тычыцца і тых, хто бачыць сябе ў крэсле кіраўніка. Міністр інфармацыі Лілія Ананіч спадзяецца, што ў новы склад парламента трапяць толькі прафесіяналы, якія будуць прымаць актуальныя законы і развіваць палітычную культуру.

Старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія Ярмошына адзначыла, што якасны парламент можна сфарміраваць з кадраў, якія прайшлі школу мясцовых Саветаў дэпутатаў. Дарэчы, наступныя выбары ў мясцовыя Саветы адбудуцца ў лютым 2018 года. Гэта добрая магчымасць для моладзі праявіць сябе ў палітычным жыцці краіны. Лідзія Міхайлаўна ўпэўнена, што «толькі дзейнічаючы праз мясцовыя Саветы і выхоўваючы такім чынам палітыкаў, мы сфарміруем потым якасны парламент, куды павінны ісці падрыхтаваныя людзі». А маладым выбаршчыкам старшыня Цэнтрвыбаркама парэкамендавала быць адказнымі і думаць пра сваё рашэнне.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

## ■ Выбары-2016

# У адпаведнасці з міжнароднымі нормамі

**Парламенцкія выбары ў Беларусі праходзяць у адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам і міжнароднымі стандартамі. Пра гэта на прэс-канферэнцыі, адказваючы на пытанне карэспандэнта «Звязды», заявіў Ергалі БУЛЕГЕНАЎ, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Казахстана ў нашай краіне.**

Ён нагадаў, што сёлета ў Казахстане ўжо прайшлі парламенцкія выбары.

— Спадзяюся, што ў Беларусі яны пройдуць добра, — адзначыў дыпламат. — У цэлым жа гэтыя выбары — чарговы этап развіцця парламентарызму, дэмакратыі Беларусі. Мы гэта самі бачым: ідзе нармальны працэс. Таму зычым добрага, паспяховага правядзення гэтых парламенцкіх выбараў.

Па словах дыпламата, з Казахстана традыцыйна прыедзе шмат назіральнікаў.

— Ад Казахстана у Беларусь прыбудзе прыкладна 60 назіральнікаў, — паведаміў пасол. — Працаваць яны будуць не толькі ў Мінску, але і ў абласцях. Яны аб'ектыўна ацэняць парламенцкія выбары.

Падчас сустрэчы з журналістамі Ергалі Булегенаў нагадаў, што ўжо менш чым праз год у Астане адчыніцца «ЭКСПА-2017», Сусветная выстава, удзел у якой ужо пацвердзілі 97 краін і 18 міжнародных арганізацый. Дыпламат звярнуў увагу, што Беларусь адна з першых пацвердзіла ўдзел у гэтым маштабным мерапрыемстве. Па словах Ергалі Булегенава, будаўніцтва аб'ектаў выставы, ва ўзвядзенні якіх прымалі актыўны ўдзел і беларускія прадпрыемствы, знаходзіцца ў завяршальнай фазе.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

## ■ Блізкая ўлада

# ХАЧУ ЖЫЦЬ НА ПРЫРОДЗЕ, АЛЕ З ГАРАДСКІМ КАМФОРТАМ

**Старшыня Мінаблвыканкама Сямён ШАПІРА правёў прыём жыхароў Мінскага раёна. Да яго звярнулася 13 чалавек. Амаль палова з іх пражывае і працуе ў сталіцы, плаціць падаткі, так бы мовіць, у гарадскую казну. Але многія маюць у ваколіцах Мінска дом, які перайшоў да іх на правах спадчыннасці, дачу ў садовым таварыстве або будуюць сваё індывідуальнае жыллё, у тым ліку і па льготных крэдытах. І са сваімі праблемамі яны звяртаюцца не да мінскіх гарадскіх уладаў, а да абласных: уладкуйце дарогу, падвядзіце газ, камунікацыі, адрамантуйце дом, адкрыйце стацыянарную краму замест аўталаўкі. Словам, стварыце камфорт, каб было так, як у сталіцы — усё пад бокам...**

Адразу некалькі шматдзетных маці звярнуліся па пытаннях паляпшэння жыллёвых умоў і выдзялення льготных крэдытаў на будаўніцтва індывідуальных жылых дамоў. На папярэднім прыёме грамадзян у Стоўбцах кіраўнік цэнтральнага рэгіёна даручыў падрыхтаваць матэрыял на гэтую тэму і надрукаваць яго ва ўсіх раённых газетах, што і было зроблена. Але ж некаторыя, нават прачытаўшы ўсе тлумачэнні, мабыць думаюць: траплю на прыём да высокай асобы, а можа і пашанцуе. Сёлета на будаўніцтва жылля па ўсіх крыніцах фінансавання і для ўсіх структур Мінскай вобласці дзяржава выдзеліла каля 95 млн дэнамінаваных рублёў. У тым ліку 6,43 мільёна для індывідуальнага будаўніцтва. Разам з тым патрэбнасць па гэтых мэтах у Мінскай вобласці амаль у чатыры разы больш. За першае паўгоддзе асвоена 65% выдзеленай сумы — 4,19 мільёна рублёў. На Міншчыне выпрацавана адпаведная схема: размяркоўваюцца яны ў залежнасці ад ступені гатоўнасці дома.

— Там, дзе гатоўнасць самая высокая, а сума на завяршэнне патрабуецца невялікая — выдзяляем сродкі. Умоўна, дзе трэба 10 000 або 20 000 рублёў — завяршаем. А калі толькі заліты фундамент і часткова ўзведзены сцены, а для заканчэння будаўніцтва неабходна 1,5 млн рублёў, то выбачайце, — растлумачыў Сямён Шапіра. — На гэтыя грошы можна дабудаваць значна больш дамоў.

А вось спадарыню Ларысу прывяла да старшыні аблвыканкама істотная праблема. Яе брат, інвалід II групы, жыве ў інтэрнаце з 1978 года. У жыллёва-будаўнічым спажывецкім кааператыве яму прапанавалі пабудаваць двухпакаёвую кватэру. Але ён можа пацягнуць толькі аднапакаёўку. Таму і пагадзіўся перайсці ў кааператыў Сеніца, дзе такія планаваліся. І застаўся ні з чым: і без новага жылля, і без грошай.

— У 2016 годзе спынілі фінансаванне ЖБСК і ўсе 16 кааператываў вобласці, што не пачалі будаўніцтва, расфарміраваны, — растлумачылі спецыялісты. — Людзей размеркавалі па іншых кааператывах. Засталося 88 чалавек, якія не хочуць пераходзіць і патрабуюць далейшага будаўніцтва. Але на сённяшні дзень такіх фінансавых магчымасцяў няма. Жыллё цяпер узводзіцца па дзяржзаказе. Гатовую кватэру трэба купляць за свае грошы або за кошт банкаўскага крэдыту, што ў прынцыпе ў складаных эканамічных умовах таксама праблематычна.

Сапраўды, сітуацыя неадназначная. Людзі ўнеслі ўласныя асабістыя грошы на падрыхтоўку праектнай дакументацыі, штомесячныя паявыя выплаты на ўтрыманне старшыні кааператыва, казначэя, на іншыя расходы — усяго 1 млрд недэнамінаваных рублёў. Але вярнуць іх назад не могуць.

— У інтэрнаце, дзе жыве брат, няма неабходных бытавых умоў: туалета, душа, — вылівала душу сястра.

Як дапамагчы нямогламу чалавеку? У Бараўлянскім сельскім савеце грамадзянін стаіць на чарзе на сацыяльнае жыллё пад нумарам 81 — усяго ж чаргавікоў 263. У 2013 годзе ўведзены ў дзеянне 63 кватэры для гэтай катэгорыі грамадзян. Разглядаўся варыянт уключэння яго ў ЖБСК, якія ў стадыі будаўніцтва. Ды сутыкнуліся з праблемай: пры ўступленні ў кааператыў чалавек павінен узяць адмову ў тых, хто стаіць перад ім на чарзе. Але ж хто ўступіць яму?

Старшыня Мінаблвыканкама прапанаваў пасяліць інваліда ў інтэрнат, дзе створаны належныя ўмовы для пражывання. Так бы мовіць, на ўсё гатовае. Але спадарыня Ларыса адказала, што ён не хоча туды, а прымусіць яго яна не мае права. «Пашукайце для чалавека арэнднае жыллё або падбярыце інтэрнат, дзе ёсць пакой з санвузлом, душам», — звярнуўся да падначаленых кіраўнік цэнтральнага рэгіёна.

Акрамя таго, Сямён Шапіра даручыў старшыні Мінскага райвыканкама даць заяўніцы пісьмова ўсю інфармацыю па гэтым кааператыве: колькі сабралі грошай, куды яны патрачаны. А што тычыцца пытання вяртання грошай, то ёй варта падаць у суд на юрыдычную асобу — ЖБСК «Сеніца-2011», пакуль ён існуе.

**Тацццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

■ Падрабязнасці

# НЕ ТОЛЬКІ АЎГУСТОЎСКІ КАНАЛ, АЛЕ І ГРОДНА

## могуць у бязвізавым рэжыме наведваць замежныя турысты

**«Звязда» ўжо паведамляла аб адпаведных планах, і вось яны сталі рэальнасцю: Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 318 «Аб устанаўленні бязвізавага парадку ўезду і выезду замежных грамадзян».**


Фота БЕЛТА.

Дакумент вызначае бязвізавы парадак уезду на тэрыторыю Беларусі і часовага знаходжання ў турыстычных мэтах на тэрмін да пяці сутак у спецыяльным турысцка-рэкрэацыйным парку «Аўгустоўскі канал» і прылеглых да яго тэрыторыях. Гэта прадугледжана для замежных грамадзян, якія перасякаюць дзяржаўную мяжу Беларусі з Польшчай праз пункты пропуску Лясная (Рудаўка) і Брузгі (Кузніца Беластоцкая), а таксама з Літвой праз пункты пропуску Прывалка (Швэндубрэ) і Прывалка (Райгардас).

Устанаўленне бязвізавага парадку наведвання Аўгустоўскага канала заклікана садзейнічаць павялічэнню турыстычнага патоку на тэрыторыю парку, працоўнай занятасці мясцовага насельніцтва, прыцягненню інвестыцый у развіццё інфраструктуры парку, правядзенню буйных міжнародных турыстычных і спартыўных мерапрыемстваў. Указ дзейнічае да 31 снежня 2017 года з магчымасцю прадаўжэння на неакрэслены тэрмін.

Як вядома, падобныя прэферэнцыі для замежных турыстаў ужо паспяхова дзейнічаюць на тэрыторыі Нацыянальнага парку «Белавежская пушча». Але дакумент у дачыненні Аўгустоўскага канала ўнікальны тым, што ў бязвізавую зону ўваходзіць не толькі тэрыторыя гэтай воднай жамчужыны, але і Гродна, Гродзенскі раён. Такім чынам, значна ўзрастае колькасць аб'ектаў, якімі могуць зацікавіцца турысты. І, безумоўна, мясцовым уладам, турыстычным фірмам і іншым зацікаўленым трэба грамата скарыстацца гэтымі магчымасцямі. Прычым гэта тычыцца не толькі гісторыка-культурных і іншых славутасцяў, але і сферы абслугоўвання — аб'ектаў харчавання, гасцініц... Шмат што будзе залежаць і ад прапановы вандроўнікам цікавых анімацыйных праграм, розных падзейных імпрэз.

— Акцэнт таксама зробім на даступнасць усіх аб'ектаў, добрае інфармаванне пра іх, у тым ліку на замежных мовах, — кажа **начальнік упраўлення спорту і турызму Гродзенскага аблвыканкама Алег АНДРЭЙЧЫК.**

Скарыстацца бязвізавым парадкам уезду замежныя турысты могуць пасля звароту ў турыстычныя кампаніі. Тураператары адказваюць за арганізацыю адпачынку, а таксама выкананне гасцямі правілаў наведвання бязвізавай зоны. У прыватнасці, турыстам нельга пакідаць яе межы.

— Да такога рашэння мы гатовы, — зазначыў **начальнік УУС Гродзенскага аблвыканкама Вадзім СІНЯЎСКІ.** — Законапаслухмяным людзям створым камфортныя ўмовы знаходжання на нашай тэрыторыі. Патрэбным чынам зрэагуем і ў выпадку нейкіх парушэнняў.

Што тычыцца пашырэння статусу памежнага пункта пропуску Лясная (Рудаўка) на Аўгустоўскім канале з воднага яшчэ і на велапешаходны, то, верагодна, гэта будзе зроблена да пачатку наступнага турыстычнага сезона.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
*prakopchik@zviazda.by*

# З аўтамабіля — на веласіпед

**Старшыня Гродзенскага гарвыканкама Мечыслаў ГОЙ разам з актывістамі грамадскага аб'яднання «ВелаГродна», дэпутатамі, работнікамі ДАІ праехаў па горадзе на веласіпедзе, каб на свае вочы ўбачыць, якія ўмовы створаны для аматараў двухколавых транспартных сродкаў.**

Маршрут руху склаў каля 25 кіламетраў. Перыядычна рабіліся прыпынкі, каб адзначыць станоўчыя моманты альбо, наадварот, праблемныя (нанесці разметку, панізіць бардзюры, абсталяваць велапаркоўкі, устанавіць знакі і г.д.), што не заўсёды можна ўбачыць з аўтамабіля. У найбліжэйшы час надзённыя пытанні ў гэтай сферы гучаць на нарадзе з удзелам зацікаўленых службаў. Паездка была своечасовай і таму, што неўзабаве будзе абмяркоўвацца гарадскі бюджэт на наступны год і, лічыць мэр, можна прадугледзець сродкі для ўдасканалення веласіпеднай інфраструктуры. Зрэшты, часта не патрабуецца вялікіх фінансавых затрат, і таму многія праблемныя пытанні, якія ўзялі на заметку падчас гэтай паездкі, вырашаць ужо сёлета. На парадку дня ў Гродне — распрацоўка канцэпцыі развіцця веларуху, стварэнне сеткі веладарожак.

— У гэтым кірунку разлічваем у тым ліку і на сумесныя праекты трансгранічнага супрацоўніцтва з літоўскімі і польскімі партнёрамі, — зазначыў Мечыслаў Гой.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

# Папярэдзіць навучаннем

**Спецыяльныя модульныя адукацыйныя цэнтры будуць створаны па ўсёй Гомельшчыне. Мяркуецца, што з дзецьмі ў гульнявой форме і ў спецыяльных памяшканнях будуць прапрацоўваць мадэлі паводзінаў, напрыклад, пры пажары, галалёдзе, з маскітнай сеткай і многія іншыя.**

Практычныя заняткі арыентаваны на дзяцей малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту, а таксама іх бацькоў. Яны павінны навучыць правільна паводзіць сябе ў бытавых сітуацыях, якія часта прыводзяць да траўмаў ці гібелі. Да барацьбы за дзяцей будуць прыцягнуты медыкі і праваахоўнікі, а таксама спецыялісты МНС і канкрэтныя сем'і. Даручэнне пра стварэнне новай структуры даў падчас выступлення на абласным жнівеньскім педсавеце старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Дворнік.

Стварэнне цэнтраў будзе працягам работы па прафілактыцы няшчасных выпадкаў сярод дзяцей. Дарэчы, у першым паўгоддзі на Гомельшчыне гібель непаўналетніх ад вонкавых прычын знізіліася на 38% менш трагедый. Меней у вобласці зафіксавана і правапарушэнняў з непаўналетнімі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

■ Актуальна

# МНС: ШКОЛЫ ПРАВЕРАНЫ

**Ратаўнікі завяршылі інспектаванне навучальных устаноў краіны. Згодна з апошнімі звесткамі, усе школы краіны цалкам адпавядаюць нормам супрацьпажарнага стану.**

— Як правіла, парушэнні ліквідаваліся падчас нашых праверак, якія праводзіліся перад пачаткам новага навучальнага года, — зазначыў **першы намеснік начальніка ўпраўлення нагляду і прафілактыкі МНС Уладзімір СУВОРАЎ.** — Разам з тым вопыт паказвае, што неабходна ўдасканальваць унутрыведамасны кантроль, а таксама падрыхтоўку супрацоўнікаў школ.

З 2003 года ў школах краіны адбыўся 61 пажар. Цікава, што 13 гадоў таму пажарныя выязджалі тушыць агонь ажно 13 разоў. Летась такіх выпадкаў было два, а сёлета і ўвогуле адзін. У адной з сярэдніх школ Бабруйска загарэлася памяшканне, дзе захоўваўся спартыўны інвентар. Прычынай гэтага стала неасцярожнае абыходжанне з агнём. Увогуле, на так званы чалавечы фактар прыпадае 85% пажараў у школах.

1 верасня стартуе другі этап акцыі «У цэнтры ўвагі — дзеці». На ўрачыстых лінейках і класных гадзінах ратаўнікі раскажуць, як не дапусціць надзвычайнай сітуацыі. Прафілактычныя гутаркі па традыцыі скончацца адпрацоўкай планаў эвакуацыі са школ.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*

■ Надвор'е

# РАНІЦАЙ СТАНЕ ХАЛАДНЕЙ

## Але ў першыя восеньскія выхадныя сіноптыкі яшчэ абяцаюць да 28 цяпла

**Верасень на тэрыторыі Беларусі пачнецца з цёплага і сухога надвор'я, паведаміў начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**

Праўда, у аўторак надвор'е крыху сапсуецца, калі да нас прарвецца атмасферны фронт з боку Заходняй Еўропы, які прынясе паніжэнне тэмпературы і навальнічныя дажджы. Адакі прагназуюцца паўсюдна па краіне, але яны будуць мець кароткачасовы характар. Максімальная тэмпература паветра складзе 17—23 цяпла, а на паўднёвым усходзе — плюс 24—26 градусаў. А вось з серады і да нядзелі гаспадарыць надвор'ем у краіне зноў пачне чарговы антыцыклон, які прынясе ў большасць раёнаў краіны сухую пагоду. Восень будзе адчувацца ў нас толькі ўначы і раніцай. Спецыяліст адзначыў, што характэрнай асаблівасцю першай дэкады верасня стане халаднаватая раніца, а ўдзень будзе сонечна і камфортна.

У сераду ападкаў пераважна не чакаецца, толькі ў асобных раёнах па паўночным усходзе Віцебскай вобласці пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 5—12 градусаў, а ўдзень — 17—24 цяпла. Увогуле не чакаецца дажджоў і ў чацвер, але ўначы і раніцай месцамі магчымы слабы туман. Тэмпература ўначы складзе 4—11 цяпла, а ўдзень чакаецца плюс 20—25 градусаў, па паўднёвым захадзе — да 27 цяпла. Пераважна без ападкаў прагназуецца і ў пятніцу, толькі ўдзень месцамі і па поўначы чакаюцца кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе 7—14 цяпла, удзень — плюс 21—28 градусаў.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, першыя восеньскія выхадныя ўзрадуюць нас цёплым і сухім надвор'ем, бо будзе пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай месцамі слабы туман. Тэмпература паветра ўначы нават крыху павялічыцца і складзе плюс 6—13 цяпла, удзень чакаецца плюс 19—26 градусаў, а па паўднёвым захадзе — нават да 28 цяпла. Дзмітрый Рабаў адзначыў, што, хутчэй за ўсё, кліматычнае лета ў нас працягнецца яшчэ на пару тыдняў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## ПАДАРУНАК ДА ДНЯ ВЕДАЎ

**Новая школа-сад у мікраравёне «Паўднёвы» ў Брэсце сустракае ў гэтыя дні сваіх першых гаспадароў.**

Адкрыцця педагагічнага комплексу яслі-сад—пачатковая школа №10 па вуліцы Абаронцаў Айчыны чакалі ў горадзе. Сёлета, напрыклад, шмат людзей працавалі на суботніку на гэтым аб'екце. І вось будаўніцтва скончана, завезены мэбля і абсталяванне. Вучэбныя кабінеты, бібліятэка, актавая і спартыўная залы, кабінет для заняткаў музыкай, невялікі басейн, камп'ютарны клас і шэраг іншых памяшканняў да заняткаў гатовы. Навасёламі сталі 150 дашкольнікаў і каля 350 вучняў першых-чацвёртых класаў. Важна, што будынак узведзены па прынцыпах безбар'ернага асяроддзя. Так што тут могуць навучацца дзеці, якія маюць праблемы са здароўем.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

## ПРЫСЯГНУЛІ РАДЗІМЕ

**Першакурснікі факультэта міліцыі Магілёўскага інстытута МУС далі ганаровую клятву служыць дзяржаве і народу сваёй краіны.**

Урачыстая цырымонія прысягі адбылася на знакавым для кожнага беларуса месцы мужнасці і воінскай доблесці — Буйніцкім полі. Прысвяціць сваё жыццё адной з самых гуманных прафесій на зямлі вырашылі 130 юнакоў і дзяўчат.

— Мы абавязаны памятаць пра подзвігі папярэдніх пакаленняў, захаваць мір і спакой у нашай краіне. Ганарыцеся высокім званнем супрацоўніка органаў унутраных спраў, будзьце прыкладам у вучобе і дысцыпліне на шляху да афіцэрскіх пагонаў. З гонарам нясіце званне абаронцы Радзімы, — звярнуўся да іх **начальнік Магілёўскага інстытута МУС генерал-маёр міліцыі Валерый ПАЛІШЧУК.**

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

## КАЛІ ЗБІРАЕЦЕСЯ Ў КІЕЎ АЎТОБУСАМ...

**З 1 верасня, паводле інфармацыі дзяржаўнага прадпрыемства «Мінсктранс», яно будзе выконваць наступныя рэгулярныя рэйсы.**

Аўтобусы пойдуць па маршрутах: Мінск — Кіеў адпраўленнем з Мінска ад аўтавакзала «Цэнтральны» ў 23.00 штодня, з Кіева штодня ў 19.30; Мінск — Кіеў (Акачаў) адпраўленнем з нашай сталіцы ад аўтавакзала «Цэнтральны» ў 18.00 па чацвяргах і пятніцах, з Кіева адправедна ў 21.00 па пятніцах і нядзелях.

З павелічэннем пасажырапатоку з Мінска толькі 6 верасня «Мінсктранс» будзе выконваць рэгулярныя рэйсы па маршруце Мінск — Кіеў (Акачаў) адпраўленнем ад аўтавакзала «Цэнтральны» ў 18.00, з Кіева 7 верасня ў 19.30 (без зменненняў). Адначасова толькі 6 верасня адмяняецца рэйс па маршруце Мінск — Кіеў адпраўленнем з нашай сталіцы ад аўтавакзала «Цэнтральны» ў 23.00.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## ЗНОЎ ДРАМА НА ПАЛЯВАННІ

**Тыдня не прайшло, як на Брэстчыне паляўнічы выпадкова застрэліў рыбалова, што ставіў сеткі на возеры. І зноў адбылася трагедыя, якую ўжо назвалі «браканьер забіў браканьера».**

Жыхары вёскі Руднікі Пружанскага раёна без усялякіх правілаў і дазволаў з незарэгістраванай зброяй учынілі паляванне на дзіка на кукурузным полі. У выніку 47-гадовы мужчына выпадкова застрэліў 53-гадовага. Заведзена крымінальная справа.

Паводле інфармацыі Брэсцкай міжраённай інспекцыі ахоўы жывёльнага і расліннага свету, той грамадзянін, што стаў віноўнікам гібелі таварыша, раней прыцягваўся да адказнасці за незаконнае паляванне, але, як бачым, высновы не зрабіў. Любы сапраўдны паляўнічы ведае, што страляць на шум, шорах, калі цэль не вельмі відаць, нельга. А яны страляюць. Выходзіць, што цяпер хадзіць у лесе, ля вадаёма, побач з кукурузным полем нават сярод белага дня небяспечна, калі столькі людзей маюць зброю і бяздумна ёю карыстаюцца.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

■ Літаратурныя вандроўкі

XXIII Дзень беларускага пісьменства
РАГАЧОЎ 2016

# «ПРЫЯЗДЖАЙ... І МНЕ БУДЗЕ ЛЯГЧЭЙ»

## Рагачоўскімі мясцінамі Андрэя Макаёнка

**Андрэй Макаёнак — адзін са знакамітых беларускіх драматургаў. Ён стварыў яскравых герояў свайго часу, якім даводзілася сутыкацца з выклікамі несправядліва ўладкаванага грамадства, спрабаваць застацца вернымі сабе, нягледзячы на ціск іншых. Майстар канфліктаў, барацьбы ўнутранага і знешняга, Макаёнак напісаў шматлікія творы, у якіх і сёння многія могуць убачыць паралелі з тым, што іх акружае... Напярэдадні свята беларускага пісьменства карэспандэнт «Звязды» завітала на малую радзіму творцы — родную яму Рагачоўшчыну.**




### Борхаў — згасае

Мясцін і людзей, якія захоўваюць памяткі пра пісьменніка, на шчасце, і сёння шмат.

Нарадзіўся Андрэй Макаёнак у вёсцы Борхаў Рагачоўскага раёна. Яшчэ нядаўна там стаяў дом, у якім некалі жыла яго сям'я. Той дом захоўваўся і да нашага часу, але... Сёння ім валодаюць людзі, далёкія ад разумення важнасці творчай спадчыны Макаёнка. Гэты дом не бачыцца ўладальнікам пэўнай каштоўнасцю, яго паціху разбіраюць. Ужо не стала даху і часткі сцен.

Супрацоўнікі музея вайсковай славы горада Рагачова адзначаюць, што спрабавалі змяніць ход спраў. Аднак знайсці сродкі, неабходныя для правядзення адпаведных работ, ім не ўдалося.

На сённяшні дзень захаваўся толькі зруб хаты, частка крокваў. Унутры — старыя шуфлядкі, паперы, кнігі (да самога пісьменніка яны не маюць дачынення).

Вёска Борхаў вымірае — сёння ў ёй дажывае свой век апошні мужчына.

Андрэй Макаёнак жыў у гэтым доме да трохгадовага ўзросту, а затым яго сям'я пераехала ў суседнюю вёску Журавічы.

### Дом каля возера

Што цікава, у Журавічах таксама захаваўся дом сям'і Макаёнка. І ён у абсалютна выдатным стане! Але і ім сёння валодаюць чужыя пісьменніку людзі. Старэйшыя дзеці з той сям'і ўжо пераехалі ў Мінск, там засталася толькі адна жыхарка.

Дом стаіць у досыць маляўнічым месцы — на беразе возера (а дакладней, копанкі, што на выпадак пажараў зрабілі калісьці мясцовыя жыхары). Адразу за возерам растуць дрэвы і пачынаецца дарога ў маляўнічы лес.



У свой час тут хацелі зрабіць дом-музей пісьменніка. Аднак вырашылі, што экспанатаў, якія б належалі Макаёнку асабіста, зусім мала, таму не будзе чым яго запоўніць. Вырашылі, што вычынка даражэйшая за аўчынку.

### Паміж Ясеніным і Гогалем

Аднак у Журавічах памяць пра Макаёнка жывая і актыўна падтрымліваецца і сёння. Журавіцкая школа носіць імя Андрэя Макаёнка, яго імем названа адна з вуліц пасёлка. На цэнтральнай плошчы стаіць помнік выдатнаму драматургу.



Менавіта школа з'яўляецца тым месцам, дзе найбольш шануюць пісьменніка, дзе працуе яго музей. Акурат тут захоўваюцца многія асабістыя рэчы творцы. У экспазіцыі ёсць кіёк Макаёнка, з якім ён хадзіў на работу (падарылі студэнты аднаго з інстытутаў, у якім выкладаў). Можна ўбачыць першую друкавальную машынку, пісьменнік прывёз яе з фронту і пастаянна карыстаўся.

Макаёнак займаўся цікавым калекцыянаваннем. Ён любіў на палічках у кніжных шафах, захоўваць статуэткі пісьменнікаў. Таму тут прадстаўлены маленькія бюсты Ясеніна, Талстога, Гогаля з яго асабістай калекцыі.

Захоўваецца кніга з аўтографам драматурга, падпісаная брату Івану: «Прыязджай да мяне часцей, і мне будзе лягчэй». Таксама тут ёсць яго асабісты гадзіннік і пасведчанне на ўзнагароды — медаль «За адвагу».

**«За сябе Макаёнак ніколі не гаварыў і быў вельмі сціплым. Але калі справа тычылася сяброў, людзей, якім трэба дапамагчы, рабіў неверагодныя рэчы. Мог прыйсці да партыйных кіраўнікоў нават у вобразе іншага чалавека — пераапрануцца, змяніць знешнасць. Ён прасіў, патрабаваў, дабіваўся, упэўніваў адказных асоб, што чалавеку патрэбна дапамога!**

**Вельмі любіў разыгрываць сяброў. І яны адказвалі яму тым жа. Напрыклад, прыходзілі ў вобразе міліцыянера — ён любіў і вельмі цаніў іх смешныя захады».**

Асабліва ганарацца ў музеі яго нататнікам, у якім змяшчаецца план п'есы, героі, некаторыя накіды да так і не напісанага твора.

Цікава ўбачыць шашкі і шахматы, у якія Андрэй Макаёнак калісьці падоўгу гуляў са сваім блізкім сябрам Іванам Шамякіным. Яны мелі лецішчы паблізу адзін ад аднаго, пад Мінскам, — і часам доўга засяджваліся за гульнёй.

### На партыйных пасадах

Настаўніца беларускай мовы і літаратуры Журавіцкай школы імя Андрэя Макаёнка Наталля Замарэева музеем загадвае ўжо шмат гадоў — адразу з тых часоў, як размеркавалася сюды пасля педагагічнага ўніверсітэта. За гэты час яна асабіста сустракалася з роднымі братамі пісьменніка — Іванам і Леанідам (цяпер жыве ў Маладзечне). Таксама з яго пляменнікам, які працуе ў Рагачове ў вузле электрычнай сувязі. Бываў у музеі і малодшы сын пісьменніка Сяргей. Таму праўдзівых сведчанняў пра тое, як жыў драматург, назбіралася шмат.

«Макаёнак скончыў Журавіцкую школу. Пасля паступіў у вайсковае вучылішча, аднак неўзабаве сышоў адтуль, бо па натуры быў свабодалюбівым чалавекам. Зразумеў, што кар'ера ваеннага — не яго прызванне, — адзначае Наталля Замарэева. — Вярнуўся дадому і працаваў у Журавіцкім райкаме камсамола. Затым паступіў у партыйную школу, паехаў у Мінск і там распачаў літаратурную кар'еру. Пасля вайны два гады працаваў у Журавіцкай школе настаўнікам рускай мовы, а таксама пачатковай ваеннай падрыхтоўкі».

**Драматург сябраваў з Іванам Шамякіным. Людзі, знаёмыя з імі, здзіўляліся, як два такія розныя, і па характары і па тэмпераментах, чалавекі могуць сябраваць?.. Аднак Макаёнак казаў: «Сябар — гэта не той, з кім можна пастаянна гаварыць. Сябар — гэта той, з кім можна памаўчаць».**

**Іван Шамякін у адным са сваіх успамінаў казаў: «Я сваім доўгам лічу кожны дзень напісаць хаця б некалькі радкоў. А вось Андрэй, наадварот, можа тыдзень сустракацца з людзьмі, размаўляць, а пасля сесці — і за тры ночы напісаць «Трыбунал».**

**Перад напісаннем твораў Макаёнак, натуральна, вывучаў сваіх герояў, шукаў прататыпаў, глядзеў, назіраў, абдумваў, а пасля садзіўся — і хутка пісаў. Так ствараліся многія яго п'есы.**

Пазней Макаёнак пачаў займаць досыць высокія службовыя пасады. Аднак такая работа давалася нялёгка: калі быў суддзёй у Журавіцкім раёне (раней вёска мела статус раённага цэнтра), яму было вельмі цяжка выносіць рашэнні па лёсах людзей. Сваю аддушыну знаходзіў у творчасці. «Працуючы на партыйных пасадах, творца шмат кантактаваў з людзьмі, некуды ездзіў. І ён выкарыстоўваў гэты вопыт для сваіх п'ес — як вельмі неабходны жыццёвы матэрыял. Макаёнку вельмі падабалася сустракацца, гутарыць. Яго натхненнем, мабыць, была любоў да людзей. Заўсёды лічыў, што ў яго творах галоўнае — гэта чалавек», — адзначае загадчыца музея.


Наталля ЗАМАРЭЕВА шмат ведае пра выдатнага земляка.

### Дзеці і тэатр

Варта адзначыць, што ў Журавічах захоўваюцца добрыя традыцыі, звязаныя з імем і асобай Андрэя Макаёнка. Ужо на працягу васьмі гадоў у школе праходзіць раённы фестываль дзіцячых тэатральных калектываў. У першы год на ім ставілі толькі п'есы Макаёнка. Пазней вырашылі прадстаўляць таксама творчасць Рагачоўшчыны, Гомельшчыны. А цяпер — ставяць творы драматургаў з усёй Беларусі.

Жыццё журавіцкіх школьнікаў непарыўна звязана са сцэнай. Тут адзначаюць, што, мусіць, само паветра прасякнута драматургіяй...

***

Сёлета, трэцяга верасня, напярэдадні Дня беларускага пісьменства, акурат у Журавічах збяруцца майстры прыгожага слова з усёй Гомельшчыны. Далучацца да іх і замежныя госці. Пісьменніцкую імпрэзу тут будзе ладзіць Гомельскае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі, а таксама творцы з Расіі і Украіны. Мусіць, не выпадкова муза прывяла іх менавіта на зямлю Макаёнка?..

Думаецца, яшчэ адной добрай традыцыяй Дня беларускага пісьменства магло б стаць адкрыццё дома-музея творцы, што нарадзіўся на зямлі, якая прымае свята. Пакуль ёсць яшчэ прадметы, якія можна сабраць, і жывыя сведкі...

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
**Фота аўтара.**
*Рагачоўскі раён*

### Асабісты лёс

Захаваліся юнацкія ўспаміны Андрэя Макаёнка. У іх расказваецца, што ў Журавічах жыла жанчына, якая вельмі падабалася будучаму пісьменніку. Яны сустракаліся, аднак штосьці не заладзілася ў іх адносінах. Пазней Макаёнак пісаў Шамякіну: «Не склалася ў нас з ёй. Але я вельмі шкадую, што ў свой час усё-такі не настаяў».

У юнацтве Макаёнак быў вельмі шчадралюбным. Ён заўважаў прыгожых жанчын, бачыў іх адметнасць і прывабнасць...

У шлюбе з першай жонкай, Галінай, пражыў шмат гадоў, аднак пазней пайшоў ад яе да іншай жанчыны — Любові. Чаму так адбылося, ніхто не ведае, бо пісьменнік не любіў расказваць пра асабістае жыццё. Пасля гэтага ўчынку адносіны з першай сям'ёй, у тым ліку з дзецьмі, сапсаваліся.

«Я думаю, ён безумоўна быў шчаслівым у асабістым жыцці, — адзначае Наталля Замарэева. — Нешчаслівы чалавек не змог бы напісаць такіх твораў. Гумар павінен быць лёгкім, ісці знутры — а калі ў чалавека там суцэльнае гора і няўдачы, ці атрымалася б так? А тое, што асабістае жыццё было складаным... Я думаю, нават у самага шчаслівага чалавека, ці бывае яно лёгкім?..»

■ Час і асобы

# ГІСТОРЫЮ СТВАРАЮЦЬ ЛЮДЗІ

## Гэта яшчэ раз пацвярджае новая кніга Дзмітрыя Матвейчыка «Удзельнікі паўстання 1863—1864 гадоў»

Здаецца, пра паўстанне пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага нам вядома досыць шмат, але звесткі часцей грунтуюцца на творах мастацкай літаратуры, чым на выніках навуковых даследаванняў. За вобразамі паўстанцаў, рамантызаваных Уладзімірам Караткевічам, Людмілай Рублеўскай, Адамам Мальдзісам, Алесем Наварычам, хаваюцца хутчэй выдуманыя героі, а не сапраўдныя людзі. Новы біяграфічны слоўнік, складзены кандыдатам гістарычных навук, загадчыкам аддзела публікацыі дакументаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі Дзмітрыем Матвейчыкам, дапаможа выправіць многія недакладнасці ва ўспрыманні вабразаў паўстанцаў, адказаць на важныя пытанні і нават знайсці ў ліку ўдзельнікаў паўстання сваіх продкаў.

Над гэтай кнігай Дзмітрый Матвейчык працаваў каля васьмі гадоў. Разгледзеў больш як семсот архіўных спраў, склаў сем тысяч (!) біяграфій тых асоб, хто актыўна падтрымаў паўстанне пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага. Таму і аб'ём біяграфічнага слоўніка «Удзельнікі паўстання 1863 — 1864 гадоў», што не так даўно пабачыў свет у выдавецтве «Беларусь» пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі, не можа не ўражваць.




Цікава, што гэтая кніга — не першае выданне, якое стала спосабам прадставіць фонды Нацыянальнага гістарычнага архіва (а менавіта тут захоўваюцца справы, што тычацца падзей паўстання на тэрыторыі Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў).

— У нашым архіве раней выйшаў зборнік дакументаў, прысвечаны паўстанню 1863—1864 гадоў, яго ўкладальнікам таксама выступіў Дзмітрый Матвейчык, — кажа **дырэктар Нацыянальнага гістарычнага архіва Дзмітрый ЯЦЭВІЧ**. — Зборнік быў адным з нешматлікіх у нашай краіне выданняў, што дакументальна расказваў пра падзеі паўстання на тэрыторыі Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў. І вось новая работа. Нягледзячы на тое, што гэтыя кнігі маюць адну тэматыку, іх сутнасць кардынальна розная. Зборнік прадставіў дакументы традыцыйным шляхам, а біяграфічны слоўнік стаў новай прыступкай у вывучэнні паўстання і лёсаў яго ўдзельнікаў.

Чаму ўвагу даследчыка прывабілі менавіта ўдзельнікі паўстання і чаму вынікі працы прадстаўлены менавіта ў форме біяграфічнага слоўніка?

— Падзеі 1863—1864 гадоў у беларускай гістарыяграфіі вядомыя досыць добра, але недастаткова добра даследаваныя, — тлумачыць **аўтар кнігі Дзмітрый МАТВЕЙЧЫК**. — Асабліва слаба вывучаны сацыяльны стан паўстанцаў, падзеі ў пэўным рэгіёне. Поле для працы тут шырокае, і адзін з самых плённых кірункаў — біяграфістыка. Траўгута, Каліноўскага многія ведаюць, яшчэ некалькі дзясяткаў імёнаў паўстанцаў назавуць, а астатнія яго ўдзельнікі застаюцца невядомымі. Можна сцвярджаць, што слоўнік мае на мэце вырашэнне дзвюх задач: персаніфікацыі паўстання, распаведу пра тое, хто ў ім удзельнічаў і якія наступствы ў яго лёсе мела гэтая падзея, а таксама было важна ўвесці ў навуковы ўжытак дакументы, што захоўваюцца ў Нацыянальным гістарычным архіве, даць магчымасць іншым даследчыкам таксама працаваць з імі.

Кніга «Удзельнікі паўстання 1963 — 1864 гадоў» можа быць карысная і кожнаму беларусу: па іменным паказальніку можна вызначыць, ці падтрымалі заклік Кастуся Каліноўскага вашы продкі, а па геаграфічным — прасачыць, якія падзеі адбываліся падчас паўстання ў вашым родным горадзе ці вёсцы. Цікава будзе пачытаць гэтую кнігу і пісьменніку: тут бясконцая крыніца сюжэтаў, і самае галоўнае, што героі кожнай звычайнай ці амаль фантастычнай гісторыі — рэальныя асобы, якія сапраўды жылі на нашай зямлі.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

**Мы папрасілі Дзмітрыя Матвейчыка скласці агульны партрэт, пэўнага кшталту «фотаробат» паўстанца. Вось што атрымалася:**

— Сацыяльны стан — зацверджаны або незацверджаны дваранін. Ён хутчэй небагаты, нават бедны. Сельскі жыхар (гараджан сярод паўстанцаў было не так многа). Як правіла, гэта параўнальна малады чалавек ва ўзросце ад 20 да 35 гадоў. Мужчына, хоць і ўдзел жанчын таксама не выключаны: яны актыўна ўдзельнічалі ў агітацыйнай кампаніі, а ўжо падчас паўстання збіралі і перапраўлялі ў атрады медыкаменты або забяспечвалі лекамі ўжо параненых палонных паўстанцаў у шпіталях.

■ Ці чулі?

# Гуменная, Татарская, Віленская...

## Таблічкі з гістарычнымі назвамі вуліц цяпер можна ўбачыць у Міры

**Дырэктару замкавага комплексу «Мір» Вользе Папко ўдалося адшукаць у Фэдэральным архіве нямецкага горада Кобленц дзве карты мястэчка Мір XIX стагоддзя. Дзякуючы такой знаходцы была распачата адметная ініцыятыва — на дамах вырашана было ўсталяваць таблічкі з гістарычнымі назвамі вуліц.**

«Нам удалося атрымаць фактычны матэрыял, адкуль мы ўзялі гістарычныя звесткі. Калі б трапіліся карты больш ранняга часу, на таблічках, пэўна, былі б адлюстраваныя іншыя назвы, — адзначае спецыяліст па сувязях з грамадскасцю замкавага комплексу «Мір» Анаіт Арзуманян. — Пэўныя архіўныя звесткі ўсплывалі ў Літве. Пэўна ж, могуць быць яны і ў Польшчы... Нядаўна дырэктар адшукала ў архіве ў Маскве перапіску князёў — апошніх уладальнікаў замка. Гэта былі шматлікія лісты, напісаныя Клеапатрай Святаполк-Мірскай. Нашы супрацоўнікі зрабілі копіі некаторых з іх — тых, што непасрэдна датычацца ўладкавання замка».

Днямі праца па замене шыльдачак ужо была скончана — усяго ўстаноўлена 76 новых. Дарэчы, мясцовым жыхарам такая ініцыятыва прыйшлася даспадобы: хтосьці нават прапаноўваў заплаціць за шыльду на сваім доме, аднак увесь праект цалкам праведзены за грошы замкавага комплексу.




Цікава, што ў XIX стагоддзі многія сучасныя вуліцы былі падзелены на дзве, а то і тры часткі. Напрыклад, сённяшняя вуліца 17 верасня складалася з вуліц Мінскай і Мінскага прадмесця. Вуліца Ленінградская была Завальнай, а завулак Ленінградскі — вуліцай Гуменнай.

У музеі адзначаюць, што шыльды з гістарычнымі назвамі будзе вельмі зручна выкарыстоўваць для правядзення экскурсій. Бо менавіта старыя назвы захоўваюць шмат звестак пра мінуўшчыну і многае расказваюць пра мясцовасць. На скрыжаванні колішніх вуліц Глухой, Татарскай і Віленскай стаяла мячэць. Да сённяшніх дзён яна не захавалася, але акурат дзякуючы таблічкам можна больш наглядна ўявіць месца, на якім яна размяшчалася, і яго атмасферу.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*

# Пантэон Айчыны

*Падавайце же потомкам,*
*что маете з предков.*
**Андрэй РЫМША.**

## Глеб Усяславіч
## (? — 1119)

Ён мог зрабіць шмат. Але мэты, якія менскі князь Глеб Усяславіч ставіў перад сабою, аказаліся яму не пад сілу, і жыццё ягонае закончылася не ў славе, не ў велічы здзейсненага, а на чужыне, у няволі.



**Глеб Менскі. Мастак А. Александровіч.**

З усіх сыноў Усяслава Брачыславіча Глеб праявіў унаследаваную ад бацькі энергію і неспакойны характар. Дзейсны, часам нястрыманы, ён быў народжаны для вайны, яго баявы дух гібеў у мірны час. Як ні дзіўна, менавіта ваяўнічасць Глеба і зрабілася яго слабым месцам. Не ўсё вырашаецца сілай і зброяй, асабліва ў палітыцы, дзе патрэбна і мудрасць, і вытрымка, і проста хітрасць, каб не толькі дачакацца зручнага моманту, а стварыць яго і скарыстацца плёнам на сваю карысць. І ўсё ж трэба прызнаць выключную ролю Глеба ў гісторыі Менска, як ягонага першага князя, які змог разгледзець выключнае значэнне гэтага горада ў будучыні як цэнтра яднання крыўскіх і дрыгавіцкіх земляў, адкуль можна было асвойваць землі Верхняга Панямоння. Зразумела, цяжка разважаць аб чалавеку і яго дзейнасці, калі пра яго ў летапісах захавалася некалькі радкоў. Але сам факт, што пра яго напісана ў кіеўскім летапісе, даволі знамянальны. Значыць, асоба менскага князя на той час была задужа значнай, каб ігнараваць яе, а пасля пры шматлікіх рэдагаваннях летапісаў выкінуць яго імя з гісторыі.



**Паход паўднёварускіх князёў на Менск у 1104 годзе.**

Такім чынам, што мы ведаем пра Глеба? У 1104 годзе Глеб сеў у Менску замест князя Давыда Усяславіча. Яго нібыта выгнаў полацкі князь Барыс-Рагвалод з прычыны сепаратнай палітыкі супрацоўніцтва з Кіевам, што не адпавядала полацкім інтарэсам. Апошнім часам выказана думка, што тагачасны Менск быў адміністрацыйным цэнтрам кіравання Нёманскага адгалінавання гандлёвага шляху «З варагаў у грэкі». Зразумела, самому Менску супрацоўніцтва з Кіевам было выгаднае, але не Полацку. Відаць, таму і быў заменены Давыд на Глеба, які павінен быў праводзіць палітыку ў агульнадзяржаўных інтарэсах. Выхад Менска з-пад кантролю Кіева не мог не занепакоіць кіеўскага князя Святаполка Ізяславіча, які ў 1104 годзе і выправіў у паход на Глеба кааліцыю паўднёва-рускіх дружын. Менск вытрымаў дзевяцімесячную аблогу, і ворагі беспасяхова адступілі ад горада.

Глеб, замацаваўшыся ў Менску, пачаў мэтанакіраваную палітыку пераарыентацыі Нёманскага шляху праз крывіцкія землі па Свіслачы да Дняпра. У гэты час узнікаюць гарадзішчы Свіслач, Полацкае, Ялізава. Пэўна, будаўніцтвам гэтых гарадзішчаў і займаўся Глеб. Насупраць Оршы, якая належала Смаленскай зямлі, Глеб закладвае Копысь і ўрэшце аваладвае і гэтым важным цэнтрам на Дняпры на шляху «З варагаў у грэкі». Такім чынам, у руках менскага князя апынуліся ключы ад двух найважнейшых адгалінаванняў славутага гандлёвага шляху — Нёманскага і Дняпроўскага. Гэта адразу ж парушыла кіеўскую гегемонію на ўсходнеславянскіх землях. Паўстаў новы цэнтр Менск, і яго трэба было абавязкова знішчыць, што і рабілася кіеўскімі князямі раней, у 1067 і 1089 гадах. А разбурэнне ў 1116 годзе Глебам Слуцка і вывад адтуль жыхароў у Кіеве ўспрынялі не толькі як замах на кіеўскую ўладу на дрыгавіцкіх землях, але і прамы выклік. Глеб не стаў слухаць перасцярогі і пагрозы новага вялікага князя кіеўскага Уладзіміра Манамаха і адправіў прэч яго паслоў. Магчыма, трэба было неяк схітрыць, улагодзіць канфлікт і, можа, нават дамовіцца з Манамахам, але Глеб паказаў, што не баіцца яго. А можа, радавая ганарлівасць не дазваляла прыніжацца перад катам, які некалі паліў і рабаваў Полацкую зямлю (і не толькі яе), спаліў Менск і забіў усіх ягоных жыхароў? Як Глеб мог падаць руку заклятаму ворагу? Глеба можна зразумець, апраўдаць яго ўчынак з маральнага аспекту, а вось з рацыянальнага пункту гледжання, дзейнічаў ён безразважліва. (Добра нам казаць, калі ведаем вынікі тых падзей.)

На Менск рушылі падуладныя Манамаху князі: чарнігаўскі, смаленскі, пераяслаўскі, ноўгарад-северскі. Уся Паўднёвая Русь падалася на Менск. Князі адначасова нанеслі ўдар па Менскаму княству з трох бакоў. Смаленскі князь Вячаслаў, сын Манамаха, захапіў Оршу і Копысь. Чарнігаўскія князі Яраполк і Давыд Ольгавічы захапілі і разбурылі Друцк, а жыхароў яго вывелі ў няволю. Сам Манамах абклаў Менск. Але, не ў сілах узяць горад, схіліў Глеба да міру. Так закончылася гэтая выправа. Толькі Глеб не змірыўся з паражэннем. Паводле звестак рускага гісторыка Васіля Тацішчава, Глеб Менскі разам з палачанамі ў 1119 г. «начал воевать области Владимировых детей, Новогородскую и Смоленскую». Наконт «вобласці» Смаленскай, дык зразумела, што Глеб адваёўваў Копысь і Оршу, а вось пад «Новогородской» трэба разумець памежную з Менскай зямлёй Навагрудскую зямлю, якая, пэўна, пасля 1116 года перайшла пад кіеўскую ўладу. Глеб не мог дапусціць падобнага рабавання свайго княства. Летапісы маўчаць пра вынікі ягонага «ваявання», але трэба думаць, яно было паспяховым, бо Манамах вымушаны арганізоўваць новы паход на Менск.

На гэты раз горад быў узяты, а Глеб трапіў у палон і адвезены ў Кіеў, дзе неўзабаве 13 верасня 1119 года памёр. Летапісцы замоўчваюць падрабязнасці гэтых падзей, а значыць, ёсць што ўтойваць. Думаецца, што Глеб зноў паверыў Манамаху і прыбыў у кіеўскі стан для перамоў, дзе яго, насуперак крыжовому цалаванню, зняволілі, як у свой час і князя Усяслава. Але, каб не дапусціць паўтарэння падзей 1068 г. (паўстання кіян і абвяшчэння Усяслава кіеўскім князем), Глеба проста атруцілі. Менск не знішчалі, як раней, проста яго выкарыстоўвалі як крэпасць. (Кіеўскі намеснік гэтак і не дабудаваў замацаваную Глебам мураваную царкву.) Цэнтр адміністрацыі Нёманскага шляху перайшоў у Верхняе Панямонне ў Навагрудак, што спрыяла развіццю гэтага горада. Калі нагадаць, што Глеб рабіў багатыя ўклады ў Кіева-Пячэрскі манастыр, пачаў будаўніцтва мураванай царквы ў Менску, дык быў ён набожным чалавекам, карыстаўся асаблівай ласкай у Кіева-Пячэрскіх манахаў, бо пахавалі яго побач з заснавальнікам манастыра св. Фядосіем. Таксама гонару не атрымаў ніводны князь, у чым бачыцца ацэнка заслуг Глеба Усяслаўіча ў пашырэнні хрысціянства на крывіцкіх і дрыгавіцкіх землях.



**Рэканструкцыя ўсходняй часткі Менска.**

Вядома, што з жонкай, княгіняй Настассяй Яраполкаўнай, Глеб меў сыноў Расціслава, Валадара і Усевалада, таксама самых дзейсных і ваяўнічых, як і сам ён. Дачка Валадара зрабілася дацкай каралевай, яе нашчадкі і цяпер там жывуць, а значыць, кроў Глеба Менскага пульсуе ў венах цяперашніх еўрапейскіх манархаў.

**Вітаўт ЧАРОПКА.**

# ПІЯР-ТЭХНАЛОГІІ ДЛЯ ПРАФЕСІІ НАСТАЎНІКА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

З трывожных тэндэнцый Міхаіл Міронча адзначыў зніжэнне актыўнасці педагогаў у пытаннях павышэння кваліфікацыйнай катэгорыі: «Нежаданне прайсці працэдуру атэстацыі азначае, што педагог не ўпэўнены ў сабе, што ў яго заніжана самаацэнка. Значыць, і ва ўстанове адукацыі не створаны ўмовы для дэманстрацыі педагогамі свайго творчага патэнцыялу. Многімі кіраўнікамі недаацэньваецца атэстацыя як адзін з рычагоў павышэння прафесійнага майстэрства педагогаў, а значыць і ўзроўню іх заробкаў».

Летам бягучага года ў сталіцы адкрыўся Мінскі дзяржаўны педагагічны каледж, дзе будуць рыхтаваць выхавальнікаў для дашкольных устаноў і настаўнікаў пачатковых класаў — гэта два самыя балючыя месцы ў кадравым забеспячэнні. На пачатак жніўня, да прыходу маладых спецыялістаў, у мінскіх садках было каля 300 вакансій... «Мы лічым адкрыццё гарадскога педагагічнага каледжа, а таксама 16 класаў і 14 педагагічных груп у старшай школе, сваёй маленькай кіраўніцкай перамогай», — падкрэсліў Міхаіл Міронча.

## АПТЫМІЗАЦЫЯ БЕЗ НАСТУПСТВАЎ

У Мінску да 2020 года плануецца пабудаваць 10 школ і 14 дзіцячых садкаў. Сёння ў сталіцы будуецца 1 школа і 4 дзіцячыя садзікі. Разам з тым праблема забяспечанасці месцамі ў дашкольных установах горада застаецца, канстатаваў кіраўнік камітэта. Асабліва актуальнае гэта пытанне для Фрунзенскага раёна сталіцы, дзе запаўняльнасць дзіцячых садоў дасягае 147%, Першамайскага (132%) і Савецкага (130%) раёнаў.

Увядзенне ў строй кожнага новага садка — важная падзея для горада і мікрараёна. Але садкі будуюцца па праектах 20-гадовай даўнасці. Вялікія светлыя будынкі, велізарныя холы, медыцынскія блокі, асобныя спартыўныя, танцавальныя залы і камп'ютарныя класы, а праектная магутнасць — усяго 230 дзяцей. «Магчыма, з улікам эканамічнай і дэмаграфічнай сітуацыі трэба ўносіць у праекты нейкія карэкціроўкі. Трэба больш рацыянальна падыходзіць да размеркавання плошчаў, павінна быць прадугледжана магчымасць іх трансфармавання ў залежнасці ад задач, каб можна было дадаткова адкрыць яшчэ адну-дзве групы, але праекціроўшчыкі нас, на жаль, не пачулі, — падкрэсліў Міхаіл Міронча. — Усё гэта ў той жа ступені тычыцца і будынкаў школ».

Між іншым, капітальны рамонт і рэканструкцыя патрабуюцца ў сталіцы кожнай пятай дашкольнай установе і кожнай чацвёртай школе і ўстанове дадатковай адукацыі. Зразумела, што стварыць у іх сучасную адукацыйную інфраструктуру вельмі няпроста.

У апошнія гады Камітэт па адукацыі паслядоўна працуе над аптымізацыяй сеткі ўстаноў адукацыі ў сталіцы.

— Трэба пралічваць не толькі эканамічны эфект, але і аддаленыя наступствы такіх крокаў, — упэўнены Міхаіл Міронча. — Кожнае рашэнне, звязанае з закрыццём установы адукацыі, павінна быць добра прадуманым і праводзіцца ў адпаведнасці з генеральным планам забудовы Мінска, каб кіраўніцкія памылкі не прывялі да новых праблем у забеспячэнні даступнасці адукацыі, асабліва ў месцах кропкавай забудовы.

**Капітальны рамонт і рэканструкцыя патрабуюцца ў сталіцы кожнай пятай дашкольнай установе і кожнай чацвёртай школе і ўстанове дадатковай адукацыі.**

Што тычыцца сеткі ўстаноў дадатковай адукацыі, то для яе найбольш актуальнай з'яўляецца не колькасная, а змястоўная аптымізацыя. На гэты момант у сталіцы дзейнічаюць 6120 аб'яднанняў па інтарэсах, але інтарэсы дзяцей і іх бацькоў пастаянна змяняюцца, і гэта таксама трэба ўлічваць.

## ХАЧУ ЦІ МАГУ?

У новым навучальным годзе ў сталіцы плануецца адкрыць 228 профільных класаў.

Па словах кіраўніка Камітэта па адукацыі, мінулы навучальны год можна назваць годам упэўненага станаўлення ў сталіцы профільнага навучання — у Мінску дзейнічала 200 профільных класаў, а годам раней — толькі 80. Адукацыйны працэс быў забяспечаны кадравымі і матэрыяльнымі рэсурсамі. 96% настаўнікаў, якія працуюць у такіх класах, мелі вышэйшую і першую кваліфікацыйную катэгорыю.

У арганізацыйным плане ў школах сталіцы ўлічылі памылкі і недапрацоўкі папярэдняга года, аказалі сур'ёзную метадычную падтрымку настаўнікам, якасна ўзбагацілі навучальны працэс новымі формамі і тэхналогіямі. У рамках адзінай інфармацыйнай адукацыйнай прасторы сталі выкарыстоўваць такія формы арганізацыі навучання школьнікаў, як дыстанцыйныя ўрокі і лекцыі, завочная школа, курсы інтэнсіўнага навучання. У змястоўным плане пашырылі для навучэнцаў магчымасці выбару профілю навучання.

Далейшыя намаганні будуць сканцэнтраваны на некалькіх напрамках — арганізацыі дапрофільнай падрыхтоўкі, фарміраванні ў вучняў усвядомленай матывацыі, супрацоўніцтве з ВНУ і ўстановамі прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. «Трэба фарміраваць у выпускнікоў і іх бацькоў адказнасць за зроблены прафесійны выбар, які цягне сур'ёзныя сацыяльныя наступствы і эканамічныя страты. Пакуль у прафесійным самавызначэнні з крытэрыяў «хачу», «магу», «трэба» дамінуе першы і практычна не працуе апошні. Нам, са свайго боку, трэба ўзмацняць педагагічнае суправаджэнне старшакласнікаў на этапе выбару прафесіі», — дадаў Міхаіл Міронча

Разам з тым кіраўнік Камітэта па адукацыі папярэдзіў: не трэба блытаць сістэму па развіцці адораных дзяцей з профільным навучаннем і тым больш ацэньваць якасць працы ў профільных класах па колькасці алімпіяднікаў. Ацэньваць трэба па колькасці выпускнікоў, якія звязалі сваю будучыню ў адпаведнасці з профілем, па якім яны навучаліся.

## ЦЬЮТАРЫ ДЛЯ АДОРАНЫХ

Міхаіл Міронча пералічыў напрамкі далейшага развіцця працы з адоранымі і высокаматываванымі дзецьмі ў сталіцы: гэта мэтанакіраваны адбор настаўнікаў, патэнцыйна гатовых да працы з адоранымі дзецьмі, абнаўленне зместу метадычнай работы з імі, а таксама стварэнне з іх ліку нефармальнай прафесійнай супольнасці.

— За кожным школьнікам, які заявіў пра сябе на алімпіядах або конкурсах і матываваны да далейшага ўдзелу ў індывідуальных спаборніцтвах, неабходна замацаваць персанальнага цьютара, — падкрэсліў кіраўнік Камітэта па адукацыі. — Мы неаднойчы казалі з высокай трыбуны, што нашы **таленавітыя дзеці пасля заканчэння школы альбо раствараюцца на прасторах блізкага ці далёкага замежжа, альбо застаюцца незаўважанымі ў агульнай масе студэнтаў ВНУ.** І на гэтым індывідуальная праграма з адоранымі вучнем заканчваецца. Для ажыццяўлення пераемнасці з ВНУ трэба больш шырока выкарыстоўваць тэхналогію партфоліа. ВНУ павінны ведаць, што да іх прыйшлі высокаматываваныя маладыя людзі, эліта, якая можа стварыць аснову прасунутага студэнцтва, а ў далейшым — касцяк перспектыўных спецыялістаў.

Старшыня профільнага камітэта ўпэўнены, што сёння неабходна казаць аб стварэнні ў Мінску агульнагарадской інфраструктуры падтрымкі адоранасці, у якой усе зацікаўленыя бакі займуць сваю нішу для выканання галоўнай задачы — дапамагчы такім дзецям рэалізавацца ў жыцці, раскрыць свой творчы патэнцыял.

## БАР'ЕРЫ Ў БЕЗБАР'ЕРНЫМ АСЯРОДДЗІ

Як заўважыў Міхаіл Міронча, нашу сістэму адукацыі вылучае вялікі гуманістычны патэнцыял, гэта тычыцца ў першую чаргу ўключэння ў агульнаадукацыйны працэс дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі, колькасць якіх пастаянна расце. Але сур'ёзнай праблемай у горадзе з'яўляецца працоўная сацыялізацыя маладых людзей з асаблівасцямі развіцця.

— Мы навучаем іх сама менеў 9 гадоў у школе, потым чатыры гады ва ўстановах прафесійнай адукацыі, даём ім і іх бацькам надзею на паўнавартасную сацыялізацыю і запатрабаванасць у грамадстве. Але што назіраем? **Працадаўцы ў нашым мегаполісе «адхрысціліся» ад гэтай праблемы. Бацькі ходзяць па кабінетах чыноўнікаў з надзеяй, што іх пачуюць, а ўсе мы разам не вытрымліваем экзамен на чалавечнасць.** Усе нашы намаганні (матэрыяльныя, кадравыя, кіраўніцкія) не дадуць чаканага эфекту, пакуль не знікнуць псіхалагічныя бар'еры ў дачыненні да дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі. Дзеці гатовы быць побач адно з адным: пытанне, хутчэй, у бацьках, педагогах, людзях вакол іх. Яны ствараюць бар'еры ў безбар'ерным асяроддзі — псіхалагічныя, маральна-духоўныя, фізічныя, — канстатаваў Міхаіл Міронча. — Мы шмат гаворым пра развіццё талерантнасці, праводзім масу мерапрыемстваў і акцый з прыцягненнем вялікай колькасці людзей, мноства сацыяльных партнёраў.... Але яны не прыносяць чаканага выніку. Значыць, формы і метады выкарыстоўваем не зусім тыя?

**«Сёння неабходна казаць аб стварэнні ў Мінску агульнагарадской інфраструктуры падтрымкі адоранасці».**

## ПАРТНЁРЫ ЦІ СПАЖЫЎЦЫ ПАСЛУГ?

Узняў кіраўнік сталічнай сістэмы адукацыі і яшчэ адну важную праблему — спажывецкага стаўлення да адукацыі.

— У пэўнай частцы бацькоў у апошнія гады сфарміравалася ўспрыманне школы і дашкольных устаноў як цэнтраў аказання адукацыйных паслуг. І гэта на фоне таго, што сёлетнія бацькі як асобы фарміраваліся ў постсавецкі перыяд, у часы «закісання розумаў». Вось і атрымліваецца, што аб'ектамі нашага педагагічнага ўздзеяння мусяць быць не толькі дзеці, але і іх бацькі. І ў адукацыі, і ў сям'і мэты агульныя — фарміраванне асобы дзіцяці, таму педагогі і бацькі павінны стаць паўнапраўнымі партнёрамі. Лічу, наспела неабходнасць стварэння гарадской бацькоўскай рады або грамадскага аб'яднання, куды ўвайшлі б найбольш актыўныя бацькі, — падзяліўся сваім бачаннем сітуацыі Міхаіл Міронча.

Падтрымаў кіраўніка Камітэта па адукацыі і міністр адукацыі Міхаіл Жураўкоў. «Стэрэатып спажывецкага стаўлення бацькоў да школы неабходна мяняць. Нагадаю, што ў сістэме адукацыі тры кампаненты — настаўнікі, вучні і бацькі. Давайце больш актыўна прыцягваць бацькоў не да вырашэння матэрыяльных пытанняў, а да навучальнага працэсу», — звярнуўся да ўдзельнікаў форуму кіраўнік міністэрства.

Міхаіл Жураўкоў заклікаў педагогаў сталіцы да дыялогу з бацькамі. «Давайце тлумачыць ім, што калі яны не будуць удзяляць увагу вучобе дзяцей дома, не будуць асабістым прыкладам выхоўваць іх, то нічога і ў нас не атрымаецца...»

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА**

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| ЛОТ 7 | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения | Капитальное строение, инв. № 400/С-79015 (назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – здание бытовки), площадью 128,4 кв.м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 16д. Составные части и принадлежности: цементобетонное покрытие, площадью 8 кв.м, ограждение из металлической сетки протяженностью 48,0 м |
| Земельный участок, на котором расположен объект | Кадастровый номер 440100000001006832, площадью 0,0325 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания бытовки), расположен по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 16д |
| Начальная цена продажи | 32 000 р. (тридцать две тысячи рублей) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 3 200 р. (три тысячи двести рублей) |
| Условия аукциона | Без условий |
| Продавец | Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 96-06-74 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32 |
| Условия оплаты | По договоренности сторон |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 14 сентября 2016 г. в 15.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 16.06.2015 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 08 сентября 2016 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», http://grodnoino.by/**

Сумесны выпуск газеты «Звязда» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя № 3 (11)


# КІВІ НА ГРАДКАХ, БАГАМОЛЫ Ў ГАРАДАХ І ІНШЫЯ СЮРПРЫЗЫ ПАЦЯПЛЕННЯ

## ЯК ЗМЯНЯЕЦЦА БЕЛАРУСКАЯ ПРЫРОДА З РОСТАМ СЯРЭДНЕГАДАВОЙ ТЭМПЕРАТУРЫ ПАВЕТРА?

**З пачатку XX стагоддзя сярэдняя тэмпература паветра ў свеце ўзрасла на 0,74 °C, прычым працэс гэты стаў актыўна нарастаць пасля 80-х гадоў. Умоўны адлік пачатку пацяплення ў Беларусі вядзецца з 1989 года: зіма ў тым годзе была вельмі цёплай. Метэаролагі не фіксавалі падобных змен за ўсю гісторыю назіранняў у краіне (вядуцца з 1881 года. — Аўт.). Сярэднегадавая тэмпература ў Беларусі павялічылася на 1,2 °C, асабліва гэта адчувалася ў зімовыя і вясновыя месяцы. І хоць навукоўцы кажуць, што пацяпленне — з'ява цыклічная, за апошнія дзесяцігоддзі актыўная дзейнасць чалавека значна паскорыла гэты працэс. Да канца стагоддзя эксперты прагназуюць павышэнне тэмпературы на 2-3 °C. Як гэта адаб'ецца на флоры і фаўне Беларусі — расказваюць спецыялісты.**



### Сустракайце шэрага кажана

Вучоныя з Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па біярэсурсах непасрэдна не звязваюць змяненне клімату і трансфармацыі жывёльнага свету. У той жа час яны прызнаюць: анамаліі надвор'я, як узімку, так і ўлетку, уплываюць на прадстаўнікоў беларускай фауны.

Жыццядзейнасць насякомых залежыць ад тэмпературы навакольнага асяроддзя: пры ее павышэнні расце і актыўнасць насякомых, аднак сталая спякота вышэй за +30 °C дзейнічае на іх прыгнятальна.

— Ва ўмовах гарачага клімату працэс развіцця гэтых істот аптымізуецца — за сезон насякомыя могуць узнаўляць некалькі пакаленняў, чым значна павялічваюць сваю колькасць, — расказвае намеснік генеральнага дырэктара НПЦ па навуцы і інавацыйнай рабоце Вадзім Цынкевіч. — Але калі высокая тэмпература паветра трымаецца доўгі час і няма ападкаў, актыўнасць насякомых днём змяншаецца і зрушваецца на раніцы ці вячэрнія гадзіны. Неспрыяльныя ўмовы яны чакаюць у прахалодных сховішчах, закрытых ад сонечных промняў.

Цёплыя зімы — адна з прычын прасоўвання на поўнач і паўночны ўсход відаў, якія маюць паўднёвае распаўсюджанне. У Беларусі, напрыклад, частым госцем стаў багамол. Па звестках навукоўцаў, ён актыўна перамяшчаецца з паўднёвых і паўднёва-усходніх рэгіёнаў і ўжо дасягнуў Віцебскай вобласці.

А вось на паводзінах амфібій і рэптылій змяненне клімату пакуль не адбіваецца.

— Сёння няма пэўных звестак пра тое, што, напрыклад, травяная ці вастрамордая жабы сталі нераставаць раней звычайнага тэрміну, — кажа вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі наземных беспазваночных жывёл Сяргей Драбянкоў. — Так, на працягу аднаго дзесяцігоддзя адбываюцца розныя часовыя зрухі ў жыццядзейнасці амфібій і рэптылій. Але гэтыя працэс тлумачыцца толькі ваганнем надвор'я.

Апошнім часам у нашай краіне рэгіструюць новыя віды рукакрылых, напрыклад шэрага і міжземнаморскага кажаноў. А віды, якія, лічылася раней, мігруюць (двухколерны кажан, рудая вячэрніца і інш.), усё часцей сталі заставацца на зімоўку ў беларускіх гарадах. Так, двухколерны кажан складае каля 80% кажаноў, якія рэгіструюцца на зімоўцы ў Мінску.

### У птушак — праблемы з гнездаваннем

На тэрміны міграцыі еўрапейскіх птушак уплывае велічыня індэксу паўночнаатлантычнага вагання (ПАВ) — пераразмеркавання атмасферных мас паміж Арктыкай і субтрапічнай Атлантыкай, якое выклікае вялікія змены ў полі ветру, пераносах цяпла і вільгаці, у інтэнсіўнасці штармоў і г.д. На працягу апошніх ста гадоў гэты індэкс узрастае, што прыводзіць да павышэння тэмпературы паветра ў рэгіёне.

Паводле даследаванняў, доўгачасовая сувязь з індэксам ПАВ існуе для шматлікіх відаў кулікоў і вераб'іных, якія гняздуюцца ў Еўропе і Скандынавіі. У Беларусі таксама адзначаецца гэта тэндэнцыя: некаторыя віды птушак увесну сталі прылятаць раней тэрміну. Напрыклад крывок, кулік-чарняк, фіфі, кулік-марадунка і кулік-перавозчык.

Як адзначае Наталля Карлюнава, вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі арніталогіі, самым «адчувальным» да пагодных змен аказаўся кулік-перавозчык — за апошнія 10 гадоў час яго прылёту зрушыўся на 11 дзён.

Але, нягледзячы на ранняе вяртанне, тэрміны гнездавання птушкі пакуль змяняць не спяшаюцца. Анамальныя паводзіны яны прадэманстравалі толькі ўвесну мінулага года, калі некаторыя з іх пачалі будаваць і абжываць гнёзды толькі праз 1,5-2 месяцы пасля прылёту.

У апошнія гады некаторыя птушкі сталі пазней адлятаць увосень у выраі ці наогул адзінкава застаюцца зімаваць на радзіме. Так робяць чорны дрозд і малінаўка, на захадзе краіны часам сустракаюцца асобіны перавозчыка, бакаса і гаршнэпа. Але ўстойлівай тэндэнцыі да павелічэння ліку птушак, якія зімуюць у Беларусі, пакуль не назіраецца.



Багамол-«заваёўнік» сёння рэгіструецца і на Віцебшчыне.

### Цяпло драпежнікам на руку

— На прадстаўнікоў класа млекакормячых цёплыя зімы і досыць гарачыя летнія перыяды ўздзейнічаюць у цэлым станоўча, — гаворыць старшы навуковы супрацоўнік лабараторыі тэрыялогіі Рыгор Янута. — Напрыклад, павялічваецца колькасць капытных жывёл: казулі, высакароднага алення і іншых, а таксама драпежнікаў. Невялікі прырост дэманструе і буры мядзведзь, які, па звестках паляўнічых, апошнім часам зменшыў перыяд спячкі.

Нягледзячы на павышэнне тэмпературы, холадаўстойлівыя беларускія жывёлы не спяшаюцца міграваць на поўнач. Па-ранейшаму вялікая ў нашай краіне колькасць папуляцыі ласся — яркага прадстаўніка барэальных (паўночных) відаў. Разам з тым, жывёлы з паўднёвых рэгіёнаў усё часцей сталі заходзіць на тэрыторыю Беларусі. Напрыклад, жыхар Паўднёвай Азіі — шакал — быў заўважаны ў нас, а таксама ў Польшчы і нават Эстоніі. Навукоўцы мяркуюць, што прычынай «візіту» могуць быць не столькі змяненне клімату, колькі розныя вандроўкі ці ўнутрыпапуляцыйныя з'явы.

Як адзначае Вадзім Цынкевіч, фаўна змяняецца ўвесь час. На гэты працэс уплывае мноства знешніх і ўнутраных фактараў: як прыродна-кліматычных, так і біялагічных. Трансфармацыі могуць адбывацца як на працягу сезона, так і за большы перыяд. Напрыклад, яшчэ некалькі тысячагоддзяў назад на абшарах нашай краіны сустракаліся віды, характэрныя для стэпавага рэгіёна, а ў пасляледавіковы перыяд тэрыторыя была заселена насельнікамі тундры і тайгі.

### Кактусы паспяхова зімуюць, а лугавыя архідэі знікаюць

Павышэнне тэмператур прывяло да зрушэння кліматычных зон і з'яўлення ў Беларусі (у Брэсцкай і Гомельскай абласцях) чацвёртай агракліматычнай зоны, якая характарызуецца найбольш працяглым вегетацыйным перыядам. У пошуках халадненькіх умоў адны расліны «ўцякаюць» на поўнач, а іншыя «наступаюць» з поўдня. Батанікі рэгіструюць усё больш выпадкаў «міграцый».

— Некалькі гадоў таму ў Мінску выявілі амялу белую, паўночная мяжа арэала якой раней праходзіла за 30-50 км на поўдзень ад сталіцы. Як відаць, умовы для вечназялёнага мнагалетніка, які не выжывае пры моцных маразах, сталі спрыяльнымі, — адзначае старшы навуковы супрацоўнік лабараторыі флоры і сістэматыкі раслін Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В.Ф. Купрэвіча НАН Беларусі Аркадзь Скуратовіч. — Від, які прапісаўся на поўдні краіны, прасоўваецца ў паўночным напрамку. Думаю, не за горамі той час, калі амяла з'явіцца і ў Віцебску.

Батанікі адзначаюць, што адсачыць кліматычныя змены прасцей за ўсё па дэкаратыўных відах раслін: калі прыжываюцца ў новых умовах, значыць, змены відавочныя. Так, беларускія садаводы-аматары ўжо паспяхова вырошчваюць апунцыі і іншых прадстаўнікоў сямейства кактусавых, лаўравішню, падуб. Яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў назад ажыццявіць гэту ідэю на практыцы было немагчыма: экзоты гінулі.


*(Заканчэнне на 8-й стар.)*


---

**Актуальна**

# ЧАГО НАМ НЕ ХАПАЕ НА ПРЫРОДЗЕ

**На сумесным пасяджэнні калегій Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя і Міністэрства спорту і турызму разглядаліся перспектыўныя кірункі развіцця экалагічнага турызму ў краіне. У выязным пасяджэнні, якое праходзіла на турыстычнай базе «Сябрыньскія азёры» ў Налібоцкай пушчы, прынялі ўдзел прадстаўнікі як міністэрстваў, так і гарадскіх і абласных выканаўчых камітэтаў з усёй краіны, а таксама кіраўнікі арганізацый, падначаленых Мінпрыроды.**

Асабліва ахоўныя прыродныя тэрыторыі з унікальнымі формамі рэльефу, маляўнічымі азёрамі і рэдкімі відамі флоры і фаўны займаюць 8,8% тэрыторыі краіны. Асноўная іх функцыя — захаванне прыродных экасістэм, але разам з тым гэтыя аб'екты прыдатныя і для экатурызму. У Беларусі ўжо ёсць неблагія дасягненні — Бярэзінскі біясферны запаведнік, Белавежская пушча, Браслаўскія азёры, Аўгустоўскі канал і іншыя сталі сапраўднымі брэндамі гэтай галіны. І Налібоцкая пушча таксама не выключэнне. Факт выбару месца правядзення калегіі гаворыць сам за сябе. Заказнік «Налібоцкі» — адзін з самых буйных у краіне, яго прыбытак у год складае больш за 1,2 млрд недэнамінаваных рублёў. Па словах міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэя Каўхуты, спалучэнне экалагічных мерапрыемстваў Мінпрыроды з прафесійным поглядам Міністэрства спорту і турызму дасць штуршок для далейшага развіцця актуальнага сёння экатурызму на прыкладзе замежных краін.

У нашай краіне экатурызм у цэлым развіваецца не вельмі актыўна, пакуль яго патэнцыял рэалізаваны менш чым на трэцюю частку. На калегіі акрэслілі асноўныя праблемы, якія запавольваюць прыродны турызм: неразвітасць сферы паслуг, кадравы «голад» (адсутнасць кваліфікаваных спецыялістаў, якія валодаюць замежнымі мовамі), дрэнная каардынацыя дзеянняў паміж рознымі кіруючымі органамі, візавы рэжым, неабходнасць дазволу на наведванне прыгранічных зон, недахоп рэкламы, адсутнасць інфармацыі ў інтэрнэце. Фінансаванне мерапрыемстваў па развіцці экатурызму будзе ажыццяўляцца за сродкі рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, але ўдзельнікі калегіі гаварылі і пра неабходнасць стварэння апякунскіх саветаў, у якія ўвойдуць прадстаўнікі прыватнага бізнесу і насельніцтва, а таксама пра пошук донараў міжнароднай тэхнічнай дапамогі.

Для далейшай сістэмнай і мэтанакіраванай работы па развіцці экалагічнага турызму на асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях на сумеснай калегіі вырашылі забяспечыць стварэнне на базе Бел НДЦ «Экалогія» сектара, які адказвае за пытанні развіцця экалагічнага турызму і выпусціць прэзентацыйнае выданне аб асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях Беларусі; сумесна з Мінспорту і Дзяржпагранкамітэтам распрацаваць пытанне бязвізавага наведвання трансгранічных прыродных тэрыторый «Котра—Чапкяляй», «Рычы—Сілэнэ», Браслаўскія азёры—Аўгшдаўгава»; забяспечыць правядзенне навучання спецыялістаў тэрытарыяльных органаў Мінпрыроды, ДПУ, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў па пытаннях экатурызму. Адобрылі некалькі праектаў і комплексы мер па развіцці экатурызму да 2025 года, прапанавалі выканкамам разглядаць на пасяджэннях пытанні развіцця экатурызму.

Трэба адзначыць, што пры абмеркаванні пытанняў развіцця экатурызму спецыялісты не забыліся і на ахову прыродных тэрыторый, адкрытых для наведвання. Удзельнікі мерапрыемства адзначылі неабходнасць устанаўлення нарматываў дапушчальнай антрапагеннай нагрузкі на гэтыя ўнікальныя ахоўныя аб'екты.

**Вольга ПРАЛЮК.** *pralyuk@zviazda.by*

# КІВІ НА ГРАДКАХ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

Пацяпленне прывяло да таго, што ў Беларусі паспяхова вырошчваюцца дэкаратыўныя віды бамбуку. А непадалёк ад Белавежскай пушчы прыжылося... ківі. Разам з тым, навукоўцы папярэджваюць, што ў сувязі з пацяпленнем у нашых краях будуць з'яўляцца паўднёвыя віды раслін, у тым ліку небяскрыўдныя пустазеллі і інвазіўныя віды. У шматлікіх краінах некаторыя з іх ужо прызнаныя небяспечнымі, а ў нас, паколькі не паспелі шыроко распаўсюдзіцца, яшчэ не. Напрыклад, ватачнік сірыйскі раней сустракаўся на поўдні краіны, а зараз утварае зараснікі ў Мінску і нават на поўначы ад сталіцы. Ва Украіне ўжо шмат гадоў беспаспяхова змагаюцца з нашэсцем гэтых «духмяных букецікаў».

Перасоўваюцца на поўнач і чырванакніжныя расліны, хоць ім даводзіцца цяжэй: большасць рэдкіх відаў прыстасаваны да вузкаспецыялізаваных умоў (строга прымеркаваных да пэўных біятопаў) умоў існавання. Як толькі яны змяняюцца, расліна знікае. Праўда, на думку батанікаў, на састаў і колькасць рэдкай флоры ўплываюць і іншыя фактары, напрыклад культура земляробства.

— Раней кароў, авечак, коз, коней выпасвалі на балотах, сенажацях, узлесках і экасістэмы не зарасталі пустазельнай расліннасцю і хмызнякамі. Цяпер такой практыкі няма, сенажаці трансфармуюцца, а лугавыя віды раслін знікаюць. Рэдка сустракаюцца лугавыя віды архідэі, асакі. У многіх з іх статус ахоувы стаў вышэйшы. Па нашых прагнозах, у наступным выданні Чырвонай кнігі (рыхтуецца раз у 10 гадоў. — **Аўт.**) практычна ўсе лугавыя віды пяройдуць у нулявую, першую і другую катэгорыі аховы, — мяркуе Аркадзь Скуратовіч.

## Якія лясы заменяць ельнікі, што ўсыхаюць?

Век травяністых раслін кароткі, таму лугавыя экасістэмы даволі хутка рэагуюць на кліматычныя змены. Складаней ідзе справа з дрэвамі, бо жывуць яны даўжэй — ад 200 да 700 гадоў. Як клімат змяняе беларускія лясы?

На тэрыторыі нашай краіны праходзяць межы арэала трох лесаўтваральных парод дрэў: елкі еўрапейскай, граба звычайнага, вольхі шэрай. Елка і вольха — барэальныя (паўночныя) пароды, якія аддаюць перавагу халоднаму клімату. А вось граба лепш жывецца ў цяплейшых умовах. Устойлівы працяглы рост тэмпературы паветра прыводзіць да таго, што межы арэалаў дрэў пачынаюць ссоўвацца на поўнач. Напрыклад, у некаторых паўднёвых рэгіёнах елка ўжо «пасунулася» на поўнач на 20-30 км. Па грабе і алешыне такіх звестак навукоўцы пакуль падаць не могуць, але мяркуюць, што іх межы таксама ссоўваюцца на поўнач.

Ранні пачатак вегетацыйнага перыяду і павелічэнне долі двухвокісу вугляроду ў атмасферы павялічваюць прадуктыўнасць раслін, яны даўжэй назапашваюць біямасу, аднак вясення замаразкі ўсё яшчэ здараюцца. У выніку дрэвы, што «пачулі» вясну, часта моцна пашкоджваюцца замаразкамі, пасля чаго ім цяжка аднавіцца.

З пацяпленнем назіраецца эфект асушальнай меліярацыі. Калі тэмпература паветра павялічваецца, а колькасць ападкаў застаецца ранейшай, у раслін узрастае транспірацыя (працэс паглынання і выпарэння вільгаці), і яны пачынаюць высмоктваць з глебы больш вады. Такім чынам, дрэвы асушваюць прылеглыя тэрыторыі.

Адной з самых сур'ёзных праблем у лясной гаспадарцы, звязанай з пацяпленнем клімату, стала масавае ўсыханне ельнікаў. Катастрофы адбываюцца з зайздроснай перыядычнасцю: з 1994 года адзначана ўжо чатыры пікі. У перыяд пацяплення елка пакутуе з-за моцнай засухі, якая аслабляе дрэвы, а затым ад нашэсця караеда-друкара. Але прычына не толькі ў змяненні клімату, а і ў дзейнасці чалавека.

— У пасляваенны перыяд лясная гаспадарка была арыентавана на фарміраванне чыстых высокапрадукцыйных лясных насаджэнняў елкі (утвораных дрэвамі адной пароды. — **Аўт.**), — расказвае вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В.Ф. Купрэвіча Максім Ярмохін. — Але такія сістэмы няўстойлівыя да змянення клімату: дрэвы моцна аслабляюцца і становяцца выдатным кормам для насякомых-шкоднікаў і хвароб.

Аднак пасля ўсыхання ельнікаў на іх месцы зноў высаджвалі елку ў надзеі атрымаць якасную драўніну. Тым не менш перааарыентацыя лясной гаспадаркі на гадоўлю мяшаных лясоў усё ж адбылася, шмат у чым дзякуючы Стратэгіі адаптацыі лясной гаспадаркі да змянення клімату, распрацаванай у 2010 годзе. Усё часцей з'яўляюцца мяшаныя лясныя культуры, а ельнікі, якія ўсохлі, пачынаюць адначасова іншымі пародамі дрэў.


Фота БЕЛТА.
Спякота прыводзіць да масавага ўсыхання ельнікаў.

## Што кукурузе добра, то лёну — дрэнна

Пацяпленне прынесла свае плюсы і мінусы і ў сельскую гаспадарку.

— Калі раней насенне кукурузы на збожжа закуплялі за мяжой, то цяпер Беларусь цалкам забяспечвае сябе гэтым прадуктам. Пашырыліся пасевы цеплалюбівых культур: азімага ячменю, сланечніка, соі, аднагадовай цыбулі, бульбы ранніх гатункаў, — расказвае начальнік службы навукова-метадычнага забеспячэння гідраметэаралагічнага і радыяцыйна-экалагічнага маніторынгу і фондаў даных Гідрамета Віктар Мельнік. — У жніўні, як правіла, пры высокай тэмпературы выпадае меншая колькасць ападкаў, з-за чаго ўборка збожжавых праходзіць у добрых умовах.

Ствараюцца новыя сарты цеплалюбівых раслін: цыбулі рэпчатай, таматаў, агуркоў, перцу, баклажана, чарэшні, абрыкоса, арэхаплодных. У Пінскім раёне закладзены плантацыі вінаграду. Па словах спецыяліста, гаварыць пра масавую вытворчасць дынь і кавуноў пакуль не даводзіцца, але пры выкананні тэхналогіі ў паўднёвых раёнах можна атрымліваць добрыя ўраджаі бахчавых.

Аднак не ўсім культурам падыходзяць больш цёплыя ўмовы. Пагоршыліся ўраджаі бульбы сярэдніх і позніх гатункаў, лёну, капусты. Аслабілася загартоўка раслін. З'яўляюцца новыя паразітарныя і інфекцыйныя хваробы, неўласцівыя рэгіёнам.

У цэлым, за перыяд пацяплення адзначаецца рост ураджайнасці культур. У сітуацыі, якая склалася, важна правільна адаптавацца да новых умоў і забяспечыць устойлівае развіццё і захаванне экасістэм, флоры і фаўны, падкрэсліваюць эксперты. І пры гэтым у адзін голас адзначаюць: не столькі клімат уплывае на навакольнае асяроддзе, колькі дзейнасць чалавека.

**Вераніка КОЛАСАВА,**
**Кацярына РАДЗЮК.**

■ У свеце раслін

# Перапіс старых «веліканаў»

**Ведаеце, дзе растуць дрэвы-доўгажыхары? Раскажыце пра іх!**

**У краіне распачаўся праект па выяўленні, інвентарызацыі і ўліку старых дрэў і насаджэнняў. Рэалізуе яго Інстытут эксперыментальнай батанікі імя В.Ф. Купрэвіча НАН Беларусі сумесна з грамадскімі арганізацыямі «Беларуская батанічная суполка» і таварыства «Зялёная сетка» з 2016-га па 2018 год. Са жніўня супрацоўнікі інстытута пачалі ацэньваць стан дрэў і насаджэнняў на тэрыторыі Гродзенскай вобласці.**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Кіраўнік праекта Ірына Вазнячук, вядучы навуковы супрацоўнік сектара маніторынгу расліннага свету Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В.Ф. Купрэвіча, адзначыла: нягледзячы на тое, што ініцыятыва па маніторынгу старых дрэў існуе з 60-х гадоў мінулага стагоддзя, у нашай краіне мала інфармацыі аб высокаўзроставых дрэвах і насаджэннях. Сёння на Беларусі налічваецца каля 90 батанічных помнікаў прыроды рэспубліканскага значэння і 230 мясцовага.

Адной з асноўных мэт праекта з'яўляецца стварэнне навукова-папулярнага выдання аб рэдкіх і ўнікальных дрэвах Беларусі. Яго ініцыятары імкнуцца стварыць карту мясцовасці такіх дрэў, распрацаваць базу звестак «Рэдкія і ўнікальныя дрэвы і насаджэнні Беларусі», заснаваную на ГІС-тэхналогіях. Арганізацыя «Зялёная сетка» ў далейшым створыць інтэрнэт-рэсурс, дзе неабходную інфармацыю змогуць атрымаць усе ахвотныя. Эксперты, якія будуць праводзіць інвентарызацыю, стануць неадкладна размяшчаць там сабраныя звесткі. Арганізатары праекта спадзяюцца, што падчас рэалізацыі плана маніторынгу дрэў яны набудуць практычны вопыт лячэння старажытных дрэў, які ў далейшым выкладуць у публікацыі рэкамендацый па лячэнні, павышэнні ўстойлівасці і зніжэнні аварыйнасці старых дрэў.

Праект накіраваны і на выяўленне аварыйна небяспечных дрэў. З дапамогай гукавога даследавання вучоныя выявяць ступень гніласці дрэва. Гэта дапаможа мясцовым уладам прыняць рашэнне наконт іх. Вучоныя накіраваны на атрыманне цэлага пласту інфармацыі — вызначыць узрост, умовы, у якіх знаходзілася дрэва, — у далейшым гэта дапаможа выявіць даныя аднасна змянення клімату за час жыцця расліны.

Група вучоных на працягу трох гадоў павінна ахапіць сваёй работай усю Беларусь. Вопыт нашых суседзяў з Украіны паказвае, што задача гэта нялёгкая, тым не менш ва ўкраінскіх спецыялістаў атрымалася вылечыць і ўзяць пад ахову дзяржавы шматлікія дрэвы.

Цяжка пераацаніць важнасць гэтага праекта. Некаторыя дрэвы з'яўляюцца эталонамі віду, захавальнікамі каштоўнай дэндрахранalагічнай інфармацыі, забяспечваюць цэласць генафонду біялагічнай разнастайнасці мясцовасці, краіны і ўсёй Зямлі. Асобныя ўнікальныя аб'екты павінны стаць здабыткам і гонарам краіны і ўвайсці ў рэгіянальныя турыстычныя кластары. Неабходна выданне навукова-папулярнай літаратуры, далучэнне ўнікальных дрэў і насаджэнняў да сеткі турыстычных аб'ектаў.

**Вольга ПРАЛЮК.** *pralyuk@zviazda.by*

### Разам нас багата

**Інстытут эксперыментальнай батанікі імя В.Ф. Купрэвіча запрашае далучыцца да гэтай справы неабыякавых людзей, школьнікаў, студэнтаў, мясцовыя ўлады. Дапамагчы можна, збіраючы звесткі аб дрэвах і іх групах (за выключэннем помнікаў прыроды, якія ўжо даследаваны). Інфармацыю можна дасылаць на паштовы адрас: вул. Акадэмічная, д. 27, 220072, г. Мінск, электронны адрас — inform.trees@gmail.com ці па факсе 8(017) 284-18-53. Неабходна паведамляць звесткі аб месцы вырастання дрэў (па магчымасці з фотаздымкамі) і нумар тэлефона адпраўшчыка.**

■ Рэзананс

# ЦІ ЗАБРУДЗІЛАСЯ НАЧА?

**У ліпеньскім нумары ў артыкуле «Як пераадолець экалагічныя пагрозы прамысловых жывёлагадоўчых ферм» часопіс «Родная прырода» расказаў пра сітуацыю з забруджваннем ракі Начы (прыток Дняпра) у Крупскім раёне Мінскай вобласці.**

Падчас сплаву на байдарках па гэтай рацэ турысты трапілі ў затор, які складаўся, па іх звестках, з гною, водарасцяў і смецця. Пасля сплаву турысты звярнуліся да спецыялістаў няўрадавай экалагічнай установы «Цэнтр экалагічных рашэнняў» (ЦЭР), якія разам з удзельніцай сплаву Дар'яй накіраваліся на месца, каб вызначыць, адкуль у рацэ гной.

Эксперт ЦЭР Наталля Парэчына расказала, што па прыбыцці яны заўважылі трактар, які запампоўваў вадкі гной з лагуны (ямы для захоўвання адходаў) у бочку. Куды ён паехаў пасля, устанавіць не атрымалася. Затым выявіліся сельскагаспадарчыя палі, куды скідваюца адходы жывёлагадоўлі. Па словах эколагаў, падчас дажджу гной сцякае з палёў проста ў канал. Вада ў ім мутная і брудная.

Недалёка ад гэтага месца знаходзіцца свінакомплекс на 25 тысяч галоў. Мясцовыя жыхары расказалі эколагам, што да пабудовы прамысловай фермы вада ў канале заўсёды была чыстай, вадзілася рыба. Пасля вада забрудзілася, а рыба знікла. У калодзежах сялян эколагі зрабілі замеры вады і адзначылі перавышэнне гранічна дапушчальнай нормы па нітратах у 5 разоў.

Па выніках абследавання эколагі з ЦЭРа накіравалі зварот у Мінскі абласны камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

**Што ж адбылося сёлета з ракой?**

Валерый Бялаўскі, начальнік Крупскай раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя тлумачыць:

— Інспекцыя неадназрова, з выездам на месца, праводзіла абследаванні ракі Нача ў месцах, названых у звароце, для устанаўлення забруджвання вады ў ёй.

Для правядзення аб'ектыўнага разбору з прыцягненнем грамадскасці райінспекцыя прапаноўвала ўдзельніцы сплаву на байдарках Дар'і правесці сумеснае абследаванне рэчышча ракі з адборам проб вады. Аднак ад гэтай прапановы адмовіліся.

У пачатку ліпеня створаная камісія ў складзе начальніка райінспекцыі, дырэктара ЗАТ «Хацюхова», дырэктара СГФ «Шчаўры» ААТ «Здравушка-мілк» паўторна правяла абследаванне русла ракі Нача. У выніку скіду ў раку сцёкавых вод, якія ўтрымліваюць гной, яна не выявіла.

Пры абследаванні меліярацыйнага канала, размешчанага непадалёку ад свінакомплексу ЗАТ «Хацюхова», камісіяй было выяўлена, што на працягу 1 км да ўпадзення ў Начу канал сухі, а месца яго ўпадзення знаходзіцца на забалочаным участку ракі, у яе пойме. Вада на забалочаным участку, таксама тарфяныя грунты могуць надаваць каляровасць і мутнасць вадзе ў канале ў месцы ўпадзення.

Што датычыцца ўтылізацыі жывёлагадоўчых сцёкавых вод ЗАТ «Хацюхова», то на свінакомплексе выкарыстоўваецца змяшаная сістэма гноевыдалення: самацёчнасплаўная і гідразмыў. Гноеўтрымліваючыя сцёкавыя воды паслядоўна паступаюць у два бетанаваныя адстойнікі. Пасля адстойвання цвёрдая фракцыя вывозіцца на пляцоўку, размешчаную на сельгасугоддзях СГФ «Шчаўры» ААТ «Здравушка-мілк» — па рашэнні штаба па НС яна вызначана для часовага захоўвання гною. Тэрыторыя пляцоўкі абвалаваная, расцякання і месцаў трапляння сцёкавых вод у Начу не выяўлена.

Вадкая фракцыя пасля адстойвання з другога назапашвальніка-адстойніка штодня вывозіцца на палі севазвароту СГФ «Шчаўры» ААТ «Здравушка-мілк» для арашэння, размешчаныя ў межах 1,5 км ад ракі. У перыяд паводкі і ліўневых дажджоў гноеўтрымліваючыя сцёкавыя воды вывозіліся ЗАТ «Хацюхова» кругласутачна з прыцягненнем транспарту пабочных арганізацый. Падчас штотыднёвых праверак, якія праводзяцца Крупскай райінспекцыяй, расцяканняў гноеўтрымліваючых сцёкавых вод са скідам у раку Нача паблізу ад палёў арашэння не выяўлена.

Падчас праведзеных абследаванняў ракі Нача Барысаўскай міжраённай лабараторыяй аналітычнага кантролю неадназрова браліся пробы вады ў чатырох створах каля населеных пунктаў Хацюхова, Крыстопаўшчына, Прыклёнак і Жаберычы Крупскага раёна.

Аналіз атрыманых вынікаў пратаколаў вымярэнняў паказаў, што няма падстаў, якія дазваляюць зрабіць выснову пра тое, што рака Нача рэгулярна забруджваецца гноеўтрымліваючымі сцёкавымі водамі свінакомплексу ЗАТ «Хацюхова».

***Ад рэдакцыі:***

Спадзяёмся, што якасць вады ў рацэ Нача не стане больш прычынай спрэчак і разбораў, а кіраўніцтва згаданага свінакомплексу зверне ўвагу на тое, што правільна пабудаваная прыродаахоўная дзейнасць нават на прадпрыемстве — адна з галоўных перашкод узнікненню магчымых экалагічных праблем.

■ Усё, што вы хацелі ведаць пра...

# ЛЕС. СТВАРЭННЕ РУК ЧАЛАВЕЧЫХ

**Колькі разоў мы чулі, а можа, і самі прамаўлялі фразу — першародны лес. Найчасцей гучыць яна ў дачыненні да Белавежскай пушчы. А тым часам у 1842—1847 гадах праводзілася першае лесаўпарадкаванне Белавежскай пушчы. Якая сёння роля чалавека ў жыццядзейнасці лесу? Пра гэта карэспандэнту «Звязды» расказалі спецыялісты Белдзяржлеса.**

— Дзякуючы нашай рабоце, падтрымліваецца экалагічны баланс у прыродзе, у якой усё ўзаемазвязана. Лясы не растуць самі па сабе — іх ўпарадкаваннем займаюцца людзі. Ад таго, наколькі навукова абгрунтавана яны гэта робяць, залежаць памер лясных рэсурсаў, раўнамерны сцёк вод, захаванне ўрадлівых глеб, падтрымка біяразнастайнасці лясоў, — расказаў **намеснік генеральнага дырэктара Белдзяржлеса Уладзімір ДЗЮБАНАЎ.** — Нашы спецыялісты працуюць таксама ў нацыянальных парках і запаведніках, ствараюць умовы для палявання. Наша галіна зусім не высокапрыбытковая, таму працуюць тут людзі, улюбёныя ў сваю работу. Зрэшты, у гэтым вы пераканаецеся, калі пагутарыце з нашымі калегамі.

## УЛІЧАНА КОЖНАЕ ДРЭВА

Асноўная справа лесаўпарадкавання — інвентарызацыя лясоў з ацэнкай іх стану. Ажыццяўляецца яна раз у дзесяць гадоў — гэта агульнасусветная практыка. У Беларусі 118 юрыдычных асоб, што займаюцца лясной гаспадаркай. З іх 98 лясгасаў, сем — належаць Кіраўніцтву справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, па два лясгасы знаходзяцца на балансе міністэрстваў абароны і адукацыі, а таксама іншых дзяржаўных арганізацый, — увёў у курс справы **вядучы спецыяліст па лесаўпарадкавальным праектаванні, навуковы кансультант вытворчага аддзела Міхал КУЗЬМЯНКОЎ.** — Падчас інвентарызацыі нашы спецыялісты фіксуюць і аналізуюць усе змены, што адбыліся за дзесяць гадоў. Кажучы прафесійнай мовай, ажыццяўляецца таксацыя — вызначаецца аб'ём ссечаных дрэў і тых, якія растуць, запас насаджэнняў і прырост дрэў. Не будзе перабольшаннем сказаць, што ўлічана кожнае дрэва: парода, век, стан.

На падставе гэтых звестак складаецца лесаўпарадкавальны праект, у якім плануюцца мерапрыемствы па забеспячэнні рацыянальнага выкарыстання лясного фонду, эфектыўнай работы лясной гаспадаркі, захавання асяроддзеўтваральных, водаахоўных, санітарна-гігіенічных, рэкрэацыйных функцый лесу. У праекце ўсё скрупулёзна падлічана — аб'ём карысных рэсурсаў лесу: нарыхтоўка драўніны, грыбоў, ягад. І калі дарункі лесу — грыбы і ягады — можа збіраць кожны чалавек, не забываючыся пра ўсталяваныя тэрміны збору, то высечка лесу — выключна ў кампетэнцыі лясніцтва. У лесаўпарадкавальным праекце ўсё збалансавана: калі запланавана сячэнне дрэў, значыць, распісаны і абавязковыя мерапрыемствы па аднаўленні лесу — задзейнічаны гадавальнікі і прымаюцца пад увагу натуральныя метады аднаўлення лясных насаджэнняў. Апроч таго, плануюцца работы па догляду лясоў: санітарныя высечкі, рэканструкцыя, абарона ад хвароб і шкодных насякомых, прыбіранне загрувашчанасці, ахова ад пажараў. Аналіз лесаўпарадкавальных праектаў дазваляе абгрунтаваць патрэбу ў гадавальніках, насенні.

Вядома, на тэрыторыі Беларусі ёсць не толькі буйныя лясныя масівы, а і лясочкі па паўгектара пасярод поля, але і яны таксама ў базах звестак Белдзяржлеса.

— Строга сочым за пытаннямі экалогіі: у лесаўпарадкавальным праекце адзначаны пляцоўкі, на якіх забаронена гаспадарчая дзейнасць — усталяваны адмысловы рэжым лесакарыстання, аховы і абароны. Такія пляцоўкі лясоў ёсць па ўсёй краіне, ну а тэрыторыя нацыянальных паркаў уся падпадае пад спецрэжым, — працягвае Міхал Кузьмянкоў. — Можна сказаць, што лесаўпарадкавальны праект — гэта асноўны закон для працаўнікоў нашай галіны. Несанкцыянаваныя работы ў лясах праводзіць нельга! У 2015 годзе праведзены аўтарскія нагляды за ажыццяўленнем лесаўпарадкавальных праектаў у 12 лесагаспадарчых установах Мінлясгаса, лесаўпарадкаванне ў якіх праводзілася ў 2009 і 2010 гадах.

Мы бачым, што выкананне праектаў забяспечвае добрую дынаміку лясного фонду: 39,7% тэрыторыі Беларусі — гэта лясы.

Лясгасам перадаюць землі з нізкай урадлівасцю, тыя, якія нерэнтабельна выкарыстоўваць у сельскай гаспадарцы. Больш за ўсё лясоў на Гомельшчыне — 47% тэрыторыі, найменш — на Брэстчыне — 36%. Гэта не значыць, што ў Брэсцкай вобласці дрэнна працуе лясная гаспадарка, проста там больш зямель адведзена пад сельгасугоддзі. Ад прыродных умоў залежыць і тое, якія пароды дрэў лепш прыжывуцца ў той ці іншай мясцовасці.

## СТЫХІЯ НАРАБІЛА БЯДЫ

Ліпеньскі разгул стыхіі ўнёс істотныя карэктывы ў працу лясной гаспадаркі Беларусі і асабліва Мінскай вобласці. Ад урагану пацярпелі лясы Смалявіцкага, Чэрвеньскага, Бярэзінскага, Дзяржынскага, Мінскага і Стаўбцоўскага раёнаў.

За лічаныя дні спецыялісты Белдзяржлеса вызначылі аб'ёмы бяды, і адразу ж пачалася работа па расчыстцы лесу. Гэта трэба неадкладна зрабіць яшчэ і таму, каб пацярпелая ад стыхіі драўніна не страціла таварных якасцяў. Пасля такіх маштабных стыхійных бедстваў, а цяперашні ўраган — наймацнейшы за апошнія дзесяцігоддзі, уносіцца карэктывы ў лесаўпарадкавальныя праекты. Прынамсі, у тую частку, што тычыцца работ па аднаўленні лесу.

Начальнік вытворчага аддзела Белдзяржлеса Раман Бузуноўскі расказаў, што буралом пашкодзіў больш за 90 квадратных кіламетраў лесу. У Беларусі добры парк лесагаспадарчай тэхнікі, таму многія работы па ліквідацыі наступстваў стыхіі механізаваны. Аднак распрацоўка буралому — гэта першы этап, другі — аднаўленне пашкоджаных лясных масіваў.



Мабільная геаінфармацыйная сістэма, на якой дакладна бачна і лесагаспадарчая карта, і дакладнае размяшчэнне таксатара.

## ШТО ЯДНАЕ ЛЕС І КОСМАС

Белдзяржлес выраблюе і картаграфічную прадукцыю для патрэб лясной гаспадаркі. Канчатковы вынік — карты друкуе машына, падобная на велізарны прынтар. Карты ламінуюцца і іх называюць ужо планшэтамі. З імі працуюць «у полі» спецыялісты лясной гаспадаркі.

Але як складаецца карты? Адкуль атрымліваюць дакладную інфармацыю?

— У СССР здымка лясных масіваў ажыццяўлялася з самалётаў, здымкі рабілі на плёначны аэрафотаапарат, — расказаў **вядучы інжынер аддзела дыстанцыйнага зандзіравання і маніторынгу лясоў Сяргей ЦАЙ.** — Тады атрымліваўся проста малюнак. Дарэчы, гэта было не таннае задавальненне, бо сама плёнка прыстойна каштавала, плюс яе праяўка. У нейкі момант мы вымушаны былі заказаць касмічную здымку, бо стала немагчыма купіць плёнку. Аказалася, што касмічная здымка добра паказвае пажары, стыхійныя бедствы, пра лясны ж масіў дае толькі агульнае ўяўленне. Да таго ж гэта вельмі дарагая паслуга.

Ужо чатыры гады мы супрацоўнічаем з Беларускім прадпрыемствам сельскагаспадарчых аэрафотагеадэзічных пошукаў, у арсенале гэтай арганізацыі магутны лічбавы аэрафотаапарат. Адпаведна, здымкі перадаюцца адразу на сервер. Цяпер якасць і інфарматыўнасць аэрафотаздымкі на некалькі парадкаў вышэй, чым у СССР. Мы маем выяву, якая дазваляе ідэнтыфікаваць пароды дрэва, а таксама дакладныя геаграфічныя каардынаты.

Калі трэба зрабіць аператыўную здымку лесу, запускаюцца беспілотнікі. У прыватнасці, з іх былі зняты ўсе пляцоўкі, якія пацярпелі ад ліпеньскай стыхіі.

Варта адзначыць, што ў цэлым узровень камп'ютарызацыі Белдзяржлеса высокі. Інжынеры-таксатары працуюць з картамі-планшэтамі і камп'ютэрамі-планшэтамі. Даныя яны ўводзяць уручную, а вось апрацоўваюцца тыя ўжо ў аўтаматычным рэжыме. Спецыялісты аддзела дыстанцыйнага зандзіравання і маніторынгу лясоў распрацавалі шэраг камп'ютарных праграм для лясной галіны. Летам супрацоўнікамі гэтага аддзела па замове Мінлясгаса праводзіўся маніторынг пажараў у лясах з ацэнкай іх наступстваў на аснове выкарыстання матэрыялаў касмічнай здымкі, у тым ліку і з беларускага касмічнага апарата (БКА).

## НАША АГУЛЬНАЕ БАГАЦЦЕ

— Не магу сказаць, што вы пазнаёміліся з нашымі кабінетнымі работнікамі, бо вельмі часта яны выязджаюць у камандзіроўкі, — падвёў вынікі Уладзімір Дзюбанаў. — А ўявіце нашых інжынераў-таксатараў, якія ў камандзіроўках праводзяць не менш за паўгода.

Магу сказаць без лішняй сціпласці, што дзякуючы нашым спецыялістам захоўваецца экалагічны каркас тэрыторыі ўсёй краіны. Мы робім свой унёсак і ў развіццё турыстычнай галіны — усё больш замежнікаў прыязджае ў нашы запаведнікі, развіваюцца паляўнічыя гаспадаркі.

Больш за ўсё цешыць тое, што, па ацэнках Сусветнага банка, у Беларусі адсотак самавольных высечак лесу вельмі нізкі. Часам бываюць такія кур'ёзы: праводзіцца планавая высечка лесу, а жыхары найбліжэйшай вёскі ці дачнага кааператыва звяртаюцца са скаргамі, маўляў, сякуць лес. Тлумачым людзям, што на сваім агародзе яны збіраюць саспелы ўраджай, так і саспелае дрэва трэба высякаць, тым больш што на яго месца будзе пасаджана адно, а то і два маладыя дрэўцы. Нашы людзі любяць і шануюць родную прыроду, разумеюць, што гэта наша агульнае багацце.

**Аксана ЯНОЎСКАЯ**



Галоўны інжынер «Белдзяржлеса» Андрэй ТАРКАН і дырэктар прадпрыемства «Гомельлеспраект» Мікалай КАТКОЎ кантралююць якасць праведзеных лесатаксацыйных работ.

■ У свеце жывёл

# СПЫНІЦЬ РАЧЫНУЮ ЧУМУ

**Небяспечнае захворванне, занесенае чужароднымі відамі ракаў, пагражае смерцю абарыгенным жыхарам беларускіх рэк і азёр**

Каб спыніць распаўсюджванне чумы, захаваць і аднавіць пагалоўе гэтага каштоўнага прамысловага аб'екта ў жывой прыродзе, спецыялісты навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па біярэсурсах заклікаюць грамадскасць паведамляць пра з'яўленне ў ракаў сімптомаў гэтага захворвання ці рэзкае зніжэнне іх колькасці ў вадаёмах краіны.

Ракі — самыя буйныя беспазваночныя прадстаўнікі жывёльнага свету ў прэсных вадаёмах. Папуляцыі гэтых жывёл ужо не адно стагоддзе запар эксплуатуюцца чалавекам у якасці далікатэснага прадукта харчавання. Але апошнім часам колькасць ракаў няўхільна скарачаецца. На працягу апошніх 150 гадоў у краінах Еўропы іх уловы зменшыліся на 95%. Адбываецца гэта з-за шматлікіх прычын антрапагеннага і прыроднага характару. Акрамя забруджвання вадаёмаў прамысловымі і бытавымі адходамі і моцнага эксплуатацыйнага прэса, ракі таксама пакутуюць ад усялення ў вадаёмы чужародных амерыканскіх відаў ракаў. Адбываецца гэта не толькі ў сувязі з канкурэнцыяй за харчаванне і так званае месца пад сонцам, але і з-за магчымага распаўсюджвання замежнымі «гасцямі» рачынай чумы.

Як расказала вучоны сакратар НПЦ па біярэсурсах Кацярына Хейдарава, у Беларусі жывуць усяго тры віды ракаў, з якіх два — абарыгенныя (шыракапалы і даўгапалы ракі) і адзін чужародны (амерыканскі паласаты рак). У перспектыве вучоныя чакаюць з'яўлення яшчэ аднаго чужароднага для беларускай фаўны віду — амерыканскага сігнальнага рака. «Амерыканцы» падчас эвалюцыі выпрацавалі ўстойлівасць да рачынай чумы: яны з'яўляюцца пераносчыкамі ўзбуджальнікаў гэтага захворвання, аднак самі ад яго не гінуць. У абарыгенных ракаў чума, як правіла, невылечная і прыводзіць да смяротнага зыходу. Аднак апошнія даныя навукоўцаў сведчаць пра існаванне некалькіх разнавіднасцяў штамаў узбуджальніка рачынай чумы, якія адрозніваюцца ступенню сваёй патагеннасці. Таму пошук новых звестак пра механізмы перадачы і распаўсюджвання рачынай чумы, генетычныя перадумовы ўстойлівасці да гэтага захворвання — вельмі важная задача для распрацоўкі дзейсных мер па захаванні і аднаўленні пагалоўя ракаў у жывой прыродзе.

Рачыная чума ўзнікае з-за пасялення на панцыры ракаў патагенных аміцэтаў (у народзе завуцца «воднымі цвілямі»), якія разбураюць хіцін і пашкоджваюць нервовую сістэму. У заражаных жывёл з'яўляюцца адхіленні ў паводзінах, парушаецца рухальная актыўнасць, змяняецца знешні выгляд. Сярод асноўных сімптомаў захворвання навукоўцы вылучаюць наступныя: актыўнасць у светлы час сутак, парушэнне каардынацыі, хаджэнне на прамых нагах, адсутнасць рэфлексу ўцёкаў, страта некаторых канечнасцяў, параліч усяго цела ці некаторых яго частак, асвятленне вачэй і мышцаў, з'яўленне цёмных плям на панцыры і ніжнім баку брушка. Не ўсе прыкметы рачынай чумы выяўляюцца ў ракаў адначасова.

Пры выяўленні нават некаторых з пералічаных сімптомаў ці ў выпадку рэзкага зніжэння колькасці ракаў у зусім нядаўна багатым імі вадаёме паведаміце, калі ласка, спецыялістам ДНВА «НПЦ НАН Беларусі па біярэсурсах» (220072, г. Мінск, вул. Акадэмічная, 27; www.biobel.by) па тэл./факсе +375 (17) 284-15-93 ці на электронную пошту zoology@biobel.by. Давайце разам дапаможам нашым ракам!

**Вераніка КОЛАСАВА.**

*kolasava@zviazda.by*

■ Рэпартаж

# «ІДУЦЬ КАСЦЫ, ЗВІНЯЦЬ ІХ КОСЫ...»



Касцы перад стартам.

Вядомыя радкі з паэмы Якуба Коласа «Новая зямля» міжволі прыйшлі на памяць падчас адкрыцця экалагічнага фестывалю «Спораўскія сенакосы», што сёлета праводзіўся на Брэстчыне дзясяты, юбілейны, раз. Галоўная падзея свята — нацыянальны чэмпіянат па ручной касьбе — штогод збірае на тэрыторыі нізінных балот заказніка «Спораўскі» як аматараў са значным спаборніцкім стажам, так і дэбютантаў, мужчын і жанчын розных прафесій і ўзростаў.

Сёлета 23 каманды-дуэты, што прадстаўлялі ці не ўсю геаграфію Беларусі, дэманстравалі свае сілы і майстэрства ў касьбе. Суддзі ішлі ўслед за ўдзельнікамі, пільна ацэньваючы якасць «вытканага» імі пракоса шырынёй у тры метры. А для назіральнікаў між тым разгортвалася відовішча, якое ўражвала і зачароўвала. Пад сінім жнівеньскім небам стальнымі маланкамі мільгалі косы, па шырокай дузе скіраваныя моцнымі прыгожымі рухамі касцоў. Шапацеў травастой, нізка схіляючыся перад іх няспынным націскам, каб урэшце пакорна ўпасці пад ногі пераможцам.

Першае месца за хуткасць і якасць заваявалі «Какорыцкія асілкі» з Драгічынскага раёна — Аляксандр Шыкула і Віктар Дашкевіч. Абодвум крыху за дваццаць, але хлопцы ўразілі вопытных касцоў і суддзяў сваімі майстэрствам і спрытам. На другое і трэцяе месцы з невялікім адрывам выйшлі адпаведна каманды «Заказнік «Званец»» (Драгічын) і «Полацкія хлябцы» (Паставы).

Пасля адбылося і асабістае першынство. У ім за права звацца чэмпіёнам «Спораўскіх сенакосаў-2016» спрачаліся дзесяць касцоў, якія перад гэтым прадэманстравалі лепшыя вынікі ў камандным заліку. «Салісты», таксама як у камандзе, адольвалі «стаметроўку», але ўжо шырынёй на паўтара метра. У тройцы лідараў «асілак» Аляксандр Шыкула другім дасягнуў фінішу, трэцім — Георгій Равенька з каманды ААТ «Спорава». А пераможцам стаў пастаўчанін Мікалай Яльчык. Яго вынік — 6 хвілін і 4 секунды. Не хаваючы радасці, чэмпіён прызнаўся, што тры гады ішоў да гэтага ганаровага звання:

— Прыемна было сустрэцца зноў з тымі, з кім пазнаёміўся ў «Спораве» ў папярэднія гады. Бачу ў іх не сапернікаў, у першую чаргу — аднадумцаў, — адзначыў ён.

Другой адметнай падзеяй Спораўскага фестывалю ўжо чацвёрты год з'яўляецца чэмпіянат Беларусі па футболе на балоце. З кожным разам экстрэмальная гульня прываблівае ўсё больш прыхільнікаў, і сёлета ў ёй удзельнічалі 8 каманд. Па словах арганізатараў, на наступны год плануецца нават адвесці яшчэ адну пляцоўку для футбалістаў, паколькі ахвотных вельмі шмат.

Удзельнікаў чэмпіянатаў павіншавалі ганаровыя госці свята — міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй Каўхута, намеснік пастаяннага прадстаўніка ПРААН у Беларусі Кацярына Паніклава, старшыня Бярозаўскага райвыканкама Леанід Мартынюк. І касцы, і футбалісты былі заахвочаны памятнымі падарункамі, граматамі, медалямі, а пераможцы атрымалі каштоўныя прызы.



Аляксандр Шыкула заняў другое месца ў асабістым заліку.

Госці і ўдзельнікі фестывалю з ахвотай выкарыстоўвалі нагоду, каб у захапленні агледзець прасторы заказніка з вышкі, альбо бліжэй пазнаёміцца з яго прыроднымі дзівосамі ў прагулцы па сцежках, пракладзеных проста ў балоце. Зайшоўшы ўглыб, раптам адчуваеш сябе цалкам згубленым для цывілізацыі, калі нават яшчаркі на нагрэтых сонцам дошках, здаецца, здзіўляюцца тваёй прысутнасці і крыху марудзяць перад тым, як схавацца ў траву.

Значэнне Спораўскага фестывалю не абмяжоўваецца толькі спаборніцтвам альбо забаўкамі. Прыцягненне грамадскай увагі да праблем экалогіі — вось мэта мерапрыемства. Штуршком для яго заснавання паслужыў менавіта клопат пра захаванне ўнікальнай прыроды гэтых мясцін. Міністр Андрэй Каўхута падкрэсліў плён спаборніцтваў па ручной касьбе: удзельнікі чэмпіяната ўносяць свой карысны ўклад у комплекснае ратаванне балотнай экасістэмы, «лёгкіх Еўропы», ад зарастання. Скошаная трава ідзе на корманарыхтоўкі, хмызнякі — на паліва.

Кацярына Паніклава таксама адзначыла станоўчыя тэндэнцыі мерапрыемстваў, якія тут праводзяцца. У прыватнасці, за апошнія гады ўдалося не толькі захаваць, але і павялічыць папуляцыю рэдкай птушкі — візітнай карткі заказніка «Спораўскі» — вяртлявай чаротаўкі.

**Наталля ТРАЦЭЎСКАЯ**

■ Друкуецца ў «Роднай прыродзе»

# Як падрыхтавацца да школы экалагічна?



**Вось і праляцелі летнія канікулы, і зусім хутка пачнецца новы навучальны год. Падрыхтоўка да гэтай падзеі займае шмат сіл у бацькоў і дзяцей. Давайце паспрабуем пачаць новы навучальны год экалагічна!**

**Кантрольная рэвізія.** Перад паходам у краму ўважліва перабярыце рэчы і паглядзіце, чаго вам сапраўды не хапае. Часам некаторыя старыя рэчы захоўваюцца ў добрым стане, таму іх можна выкарыстаць другі раз.Ператрэсваючы старыя сумкі, можна знайсці некалькі алоўкаў, гумку, лінейку. Распытайцеся ў знаёмых, магчыма, у іх валяюцца без справы нявыкарыстаныя сшыткі ці іншыя канцтавары. Абавязкова складзіце спіс неабходных рэчаў і толькі тады выпраўляйцеся па пакупкі.

**Другі шанц для старых рэчаў.** Пасля кожнага навучальнага перыяду застаюцца рэчы, з якіх можна нешта зрабіць. Напрыклад, у выкарыстаных сшытках хапае чыстых аркушаў, іх можна выдраць і пакінуць на чарнавікі. У старых ручках дастаткова замяніць стрыжань — і патрэба ў новых адпадае сама па сабе.

**Чытаем маркіроўку.** Цяпер нельга паскардзіцца на асартымент тавараў, прадстаўлены ў крамах. Лепш арыентавацца не на вокладку, а на маркіроўку і састаў канкрэтнай рэчы. Пазнакі сертыфікацыі FSC на сшытках, ручках, алоўках гарантуюць, што пры вытворчасці гэтых тавараў не наносілася шкода лясам. Таксама хапае папяровай прадукцыі, зробленай з другаснай сыравіны. Папера з макулатуры куды больш здаровая, чым «снежная» папера, адбеленая хлорам. Звяртайце ўвагу, з чаго зроблены рэчы — не важна, кашуля гэта, лінейка ці пластылін для лепкі. Лінейку можна набыць з драўніны, а не з пластыку, а кашулю — з ільну і бавоўны, а не з паліэстару. Старайцеся пазбягаць рэчаў, якія змяшчаюць у сабе полівінілхларыд — самы шкодны з відаў пластыку.








**Энергаэфектыўныя прылады.** Набываючы электронныя прылады з высокім узроўнем энергаэфектыўнасці («EnergoStar»), якія спажываюць на 30% менш энергіі, чым звычайныя прылады, вы таксама дапамагаеце навакольнаму асяроддзю. Не пакідайце тэхніку ў спячым рэжыме, калі адыходзіце надоўга — выключайце прылады поўнасцю. Не забывайцеся, што лепш выбіраць гаджэты, якія працуюць не на батарэйках, а на акумулятарах.

**Замест букета — кветкі ў вазоне.** У першыя дні верасня настаўніцы не ведаюць, куды падзець велізарную колькасць кветак, якія дораць вучні. Праз некалькі дзён уся квітнеючая прыгажосць аказваецца на сметніцы. Падарыце сваёй настаўніцы расліну ў гаршку — яна будзе радаваць доўгі час, а магчыма, упрыгожыць школьны кабінет.

**У школу — на ровары.** Прыходзіць новая мода — не толькі школьнікі, але і настаўнікі дабіраюцца ў школу на кліматычна нейтральным транспарце — веласіпедзе. А калі школа знаходзіцца зусім блізка ад дома, чаму б не прайсціся пешшу?

**Абед з сабой.** Куды ж без здаровага харчавання? Папрасіце маму, сястру альбо прыгатуйце ежу дома і ўпакуйце яе ў кантэйнер. Не забудзьцеся пра чыстую ваду — не набывайце штодзень новую пластыкавую бутэльку, а завядзіце тэрмас. Толькі праверце, каб у яго саставе не было бісфенолу А.

**(Матэрыял змешчаны ў дадатку да «РП» «Юны натураліст».)**


Чытайце ў жнівеньскім нумары часопіса «Родная прырода»

✓ Асцярожна, жывёлы на дарогах!

✓ Месца, дзе прырода адпачывае, ці Чым адметны першы нацыянальны біясферны рэзерват.

✓ Як пчаліны воск дапаможа захаваць здароўе.

✓ Бультэр'ер: паляўнічы... на браканьераў.





■ Экасенсацыя

# Ізноў незвычайны госць!



**У Беларусі пяты раз, упершыню за 20 гадоў, адзначылі белагаловага сіпа. Фота замежнага госця недалёка ад балота Ельня, што на Віцебшчыне, зрабіў грамадскі эколаг і пастаянны аўтар часопіса «Родная прырода» Валерый КАВАЛЁНАК.**

— Пра незвычайную птушку велізарных памераў мне паведаміў адзін з мясцовых пастухоў Алег Урбановіч, — расказвае Валерый Кавалёнак. — Ён адшукаў мяне праз маці, што жыве недалёка, у вёсцы Васількова.

Каб дабрацца да месца «візіту», патрэбен быў час, але і птушка не спяшалася адлятаць. Прыехаўшы на пашу, Валерый Кавалёнак зрабіў здалёк некалькі кадраў незвычайнага госця, каб не спудзіць яго і захаваць гэту сустрэчу ў гісторыі.

— Спярша мне здалося, што гэта грыф, але я не мог зразумець, адкуль ён тут з'явіўся, — працягвае Валерый Тэафілавіч. — Пакуль я разглядаў птушку і выбіраў лепшае месца для «фотасесіі», яна ўважліва сачыла за маімі дзеяннямі. І як толькі адчула, што да яе наблізіўся, адразу ж узмахнула крыламі і ўзляцела.

Але на гэтым сустрэча не скончылася — маладая птушка, якая сапраўды, як пазней высветлілася, аказалася адным з прадстаўнікоў роду грыфаў, прызямлілася каля статка кароў. Па словах сведак, белагаловы сіп прыляцеў сюды разам з двума бусламі і, адчуваючы небяспеку, шукаў абароны ў гэтых птушак. Наступным вечарам разам з беларускімі крылатымі сябрамі ён пакінуў Віцебшчыну і паляцеў у паўднёвым напрамку.

***

Белагаловы сіп — буйная драпежная птушка сямейства ястрабіных з доўгімі шырокімі крыламі, шырокім хвастом і непрапарцыянальна маленькай, пакрытай белым пухам галавой. Распаўсюджаны ў засушлівых горных і раўнінных ландшафтах Паўднёвай Еўропы, Азіі і Паўночнай Афрыкі, таксама гняздуецца ў гарах Каўказа. Арэал і агульная колькасць птушак гэтага віду пастаянна скарачаецца.

У Беларусі белагаловы сіп адзначаўся чатыры разы — у 1924, 1979, 1983 і 1996 гадах. 17 жніўня 2016 года адбылася пятая рэгістрацыя гэтага прадстаўніка крылатых драпежнікаў.

**Вераніка КОЛАСАВА.**

*kolasava@zviazda.by*

# НА СЕГВЕЯХ У ФІНАЛ

Нашу краіну на дзіцячым «Еўрабачанні» прадставіць Аляксандр МІНЁНАК

**Імя пераможцы нацыянальнага адборачнага этапу на дзіцячы конкурс песні «Еўрабачанне-2016» стала вядома позна ўвечары 26 жніўня па выніках фінальнага канцэрта. Удзел у ім, нагадаем, узялі 8 сольных выканаўцаў і 2 калектывы.**

Пераможцу па традыцыі выбіралі сумесна гледачы і журы. Праўда, тут сімпатыі раздзяліліся. Гледачы паставілі на першае месца прадстаўніцу Магілёва Вольгу Канавалаву, а суддзі аддалі перавагу мінчаніну Аляксандру Мінёнку, таму ў гэтых выканаўцаў атрымалася аднолькавая сума балаў. Прафесійнаму журы давялося галасаваць зноў, проста на сцэне. У выніку запаветную музычную пуцёўку на дзіцячае «Еўрабачанне-2016» і пераходны прыз — хрустальны мікрафон — атрымаў Саша Мінёнак (заўважым, адзін з усяго двух хлопцаў — фіналістаў нацыянальнага адбору). Менавіта яго песня «Музыка маіх перамог» прагучыць у сёлетнім лістападзе на дзіцячым конкурсе «Еўрабачанне».

Аляксандру Мінёнку 13 гадоў, ён выхаванец заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь, тэатра эстраднай песні «Хвілінка» сталічнага ДК МАЗ. Вакалам хлопец займаецца з 8 гадоў — і, дарэчы, самым шчаслівым днём у сваім жыцці называе той, у які ўпершыню ўзяў у рукі мікрафон. Конкурсная песня хлопца з амбіцыйнай назвай «Музыка маіх перамог», паводле слоў самога Сашы, расказвае не толькі пра яго імкненне пакінуць свой яркі след на сцэне, але і пра тое, што музыка мусіць аб'ядноўваць усіх людзей наогул, несці ім радасць і святло.



Фота БЕЛТА.

«Фішкай» нумару пераможцы сталі гіраскутары.

Нагадаем, 14-ты міжнародны дзіцячы конкурс песні «Еўрабачанне-2016» пройдзе ў абноўленым фармаце 20 лістапада ў сталіцы Мальты — Валеце. Удзел у ім, як чакаецца, возьмуць прадстаўнікі не менш як 15 краін.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## 05 октября 2016 года в 10.00 в малом зале Гомельского районного исполнительного комитета, расположенного по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, 51а, состоится аукцион по продаже земельных участков в частную собственность на право заключения договоров аренды земельных участков

| Номер лота | Наименование объекта | Место, дата, время начала и окончания приема заявлений и прилагаемых к ним документов | Кадастровый номер и адрес земельного участка, его размеры, целевое назначение, характеристика инженерных коммуникаций | Вещное право на земельный участок | Начальная цена предмета аукциона | Расходы по организации и проведению аукциона, подлежащие возмещению победителем аукциона | Размер задатка, срок и порядок его внесения, реквизиты расчетного счета | Организация, которая предоставляет информацию о месте размещения земельных участков, которые предполагается передать в аренду по результатам аукциона | Адрес и номер контактного телефона комиссии или организации |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Для коллективного садоводства (земельный участок для коллективного садоводства) | г. Гомель, ул. Ильича, 51а, каб. 111 Время начала приема заявлений: с 30.08.2016 по 30.09.2016 с 8.30 до 13.00 с 14.00 до 17.30 | 321084800019000032, площадь 0,1467 га, Гомельская обл., Гомельский район, в районе д. Плесы Поколюбичского сельсовета садоводческое товарищество «Жемчужная поляна», участок № 60. Земельный участок имеет ограничения (обременения) в использовании на площади: 0,1467 га в связи с его расположением на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона реки Сож); 0,0061 га – в охранной зоне объекта инженерной инфраструктуры (охранная зона электрических сетей); 0,0263 га – в охранной зоне объекта инженерной инфраструктуры (охранная зона сетей и сооружений водоснабжения). Имеется возможность подключения электроснабжения, водоснабжения | Частная собственность | 9 704 рубля 99 копеек | 961 рубль 63 копейки + расходы, связанные с опубликованием объявления | 970 рублей 50 копеек на р/с Гомельского райисполкома 3641414000270, филиала № 302 ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 151501664, УНП 400178549 | Землеустроительная служба Гомельского районного исполнительного комитета г. Гомель, ул. Ильича, д. 51а, кабинет 111, 8 0232 36 22 20 | г. Гомель, ул. Ильича, д. 51а, 36 22 20 |
| 2 | Для коллективного садоводства (земельный участок для коллективного садоводства) | г. Гомель, ул. Ильича, 51а, каб. 111 Время начала приема заявлений: с 30.08.2016 по 30.09.2016 с 8.30 до 13.00 с 14.00 до 17.30 | 321084800019000031, площадь 0,1050 га, Гомельская обл., Гомельский район, в районе д. Плесы Поколюбичского сельсовета, садоводческое товарищество «Жемчужная поляна», участок № 71. Земельный участок имеет ограничения (обременения) в использовании на площади: 0,1050 га в связи с его расположением на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона реки Сож). Имеется возможность подключения электроснабжения, водоснабжения | Частная собственность | 6 946 рублей 32 копейки | 971 рубль 54 копейки + расходы, связанные с опубликованием объявления | 694 рубля 63 копейки на р/с Гомельского райисполкома 3641414000270, филиала № 302 ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 151501664, УНП 400178549 | Землеустроительная служба Гомельского районного исполнительного комитета г. Гомель, ул. Ильича, д. 51а, кабинет 111, 8 0232 36 22 20 | г. Гомель, ул. Ильича, д. 51а, 36 22 20 |
| 3 | Для коллективного садоводства (земельный участок для коллективного садоводства) | г. Гомель, ул. Ильича, 51а, каб. 111 Время начала приема заявлений: с 30.08.2016 по 30.09.2016 с 8.30 до 13.00 с 14.00 до 17.30 | 321084800019000030, площадь 0,1015 га, Гомельская обл., Гомельский район, в районе д. Плесы Поколюбичского сельсовета, садоводческое товарищество «Жемчужная поляна», участок № 84. Земельный участок имеет ограничения (обременения) в использовании на площади: 0,1015 га в связи с его расположением на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона реки Сож). Имеется возможность подключения электроснабжения, водоснабжения | Частная собственность | 6 714 рублей 77 копеек | 1024 рубля 08 копеек + расходы, связанные с опубликованием объявления | 671 рубль 48 копеек на р/с Гомельского райисполкома 3641414000270, филиала № 302 ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 151501664, УНП 400178549 | Землеустроительная служба Гомельского районного исполнительного комитета г. Гомель, ул. Ильича, д. 51а, кабинет 111, 8 0232 36 22 20 | г. Гомель, ул. Ильича, д. 51а, 36 22 20 |
| 4 | Для коллективного садоводства (земельный участок для коллективного садоводства) | г. Гомель, ул. Ильича, 51а, каб. 111 Время начала приема заявлений: с 30.08.2016 по 30.09.2016 с 8.30 до 13.00 с 14.00 до 17.30 | 321084800019000029, площадь 0,0989 га, Гомельская обл., Гомельский район, в районе д. Плесы Поколюбичского сельсовета, садоводческое товарищество «Жемчужная поляна», участок № 97. Земельный участок имеет ограничения (обременения) в использовании на площади: 0,0989 га в связи с его расположением на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона реки Сож). Имеется возможность подключения электроснабжения, водоснабжения | Частная собственность | 6 542 рубля 77 копеек | 928 рублей 84 копейки + расходы, связанные с опубликованием объявления | 654 рубля 28 копеек на р/с Гомельского райисполкома 3641414000270, филиала № 302 ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 151501664, УНП 400178549 | Землеустроительная служба Гомельского районного исполнительного комитета г. Гомель, ул. Ильича, д. 51а, кабинет 111, 8 0232 36 22 20 | г. Гомель, ул. Ильича, д. 51а, 36 22 20 |
| 5 | Для коллективного садоводства (земельный участок для коллективного садоводства) | г. Гомель, ул. Ильича, 51а, каб. 111 Время начала приема заявлений: с 30.08.2016 по 30.09.2016 с 8.30 до 13.00 с 14.00 до 17.30 | 321084800019000033, площадь 0,0941 га, Гомельская обл., Гомельский район, в районе д. Плесы Поколюбичского сельсовета, садоводческое товарищество «Жемчужная поляна», участок № 96. Земельный участок имеет ограничения (обременения) в использовании на площади: 0,0941 га в связи с его расположением на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона реки Сож). Имеется возможность подключения электроснабжения, водоснабжения | Частная собственность | До 6 225 рублей 22 копейки | 976 рублей 97 копеек + расходы, связанные с опубликованием объявления | 622 рубля 52 копейки на р/с Гомельского райисполкома 3641414000270, филиала № 302 ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 151501664, УНП 400178549 | Землеустроительная служба Гомельского районного исполнительного комитета г. Гомель, ул. Ильича, д. 51а, кабинет 111, 8 0232 36 22 20 | г. Гомель, ул. Ильича, д. 51а, 36 22 20 |
| 6 | Для коллективного садоводства (земельный участок для коллективного садоводства) | г. Гомель, ул. Ильича, 51а, каб. 111 Время начала приема заявлений: с 30.08.2016 по 30.09.2016 с 8.30 до 13.00 с 14.00 до 17.30 | 321084800019000036, площадь 0,0713 га, Гомельская обл., Гомельский район, в районе д. Плесы Поколюбичского сельсовета, садоводческое товарищество «Жемчужная поляна», участок № 81. Земельный участок имеет ограничения (обременения) в использовании на площади: 0,0713 га в связи с его расположением на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона реки Сож). Имеется возможность подключения электроснабжения, водоснабжения | Частная собственность | 4 716 рублей 88 копеек | 970 рублей 59 копеек + расходы, связанные с опубликованием объявления | 471 рубль 68 копеек на р/с Гомельского райисполкома 3641414000270, филиала № 302 ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 151501664, УНП 400178549 | Землеустроительная служба Гомельского районного исполнительного комитета г. Гомель, ул. Ильича, д. 51а, кабинет 111, 8 0232 36 22 20 | г. Гомель, ул. Ильича, д. 51а, 36 22 20 |
| 7 | Для коллективного садоводства (земельный участок для коллективного садоводства) | г. Гомель, ул. Ильича, 51а, каб. 111 Время начала приема заявлений: с 30.08.2016 по 30.09.2016 с 8.30 до 13.00 с 14.00 до 17.30 | 321084800019000035, площадь 0,0708 га, Гомельская обл., Гомельский район, в районе д. Плесы Поколюбичского сельсовета, садоводческое товарищество «Жемчужная поляна», участок № 90. Земельный участок имеет ограничения (обременения) в использовании на площади: 0,0708 га в связи с его расположением на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона реки Сож). Имеется возможность подключения электроснабжения, водоснабжения | Частная собственность | 4 683 рубля 80 копеек | 983 рубля 35 копеек + расходы, связанные с опубликованием объявления | 468 рублей 38 копеек на р/с Гомельского райисполкома 3641414000270, филиала № 302 ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 151501664, УНП 400178549 | Землеустроительная служба Гомельского районного исполнительного комитета г. Гомель, ул. Ильича, д. 51а, кабинет 111, 8 0232 36 22 20 | г. Гомель, ул. Ильича, д. 51а, 36 22 20 |
| 8 | Для коллективного садоводства (земельный участок для коллективного садоводства) | г. Гомель, ул. Ильича, 51а, каб. 111 Время начала приема заявлений: с 30.08.2016 по 30.09.2016 с 8.30 до 13.00 с 14.00 до 17.30 | 321084800019000037, площадь 0,0533 га, Гомельская обл., Гомельский район, в районе д. Плесы Поколюбичского сельсовета садоводческое товарищество «Жемчужная поляна», участок № 102. Земельный участок имеет ограничения (обременения) в использовании на площади: 0,0533 га в связи с его расположением на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона реки Сож); 0,0029 га – в охранной зоне объекта инженерной инфраструктуры (охранная зона электрических сетей). Имеется возможность подключения электроснабжения, водоснабжения | Частная собственность | 3 383 рубля 47 копеек | 991 рубль 45 копеек + расходы, связанные с опубликованием объявления | 338 рублей 35 копеек на р/с Гомельского райисполкома 3641414000270, филиала № 302 ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 151501664, УНП 400178549 | Землеустроительная служба Гомельского районного исполнительного комитета г. Гомель, ул. Ильича, д. 51а, кабинет 111, 8 0232 36 22 20 | г. Гомель, ул. Ильича, д. 51а, 36 22 20 |
| 9 | Для коллективного садоводства (земельный участок для коллективного садоводства) | г. Гомель, ул. Ильича, 51а, каб. 111 Время начала приема заявлений: с 30.08.2016 по 30.09.2016 с 8.30 до 13.00 с 14.00 до 17.30 | 321089200071000044, площадь 0,0902 га, Гомельская обл., Гомельский район, в районе п. Знамя Труда Улуковского сельсовета садоводческое товарищество «Дорожник», участок № 26. Земельный участок имеет ограничения (обременения) в использовании на площади: 0,0201 га в связи с его расположением на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона канала Медвежий Лог); 0,0701 га в связи с его расположением на природных территориях, подлежащих специальной охране (прибрежная полоса канала Медвежий Лог) | аренда сроком на 49 лет | 665 рублей 83 копейки | 958 рублей 06 копеек + расходы, связанные с опубликованием объявления | 66 рублей 58 копеек на р/с Гомельского райисполкома 3641414000270, филиала № 302 ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 151501664, УНП 400178549 | Землеустроительная служба Гомельского районного исполнительного комитета г. Гомель, ул. Ильича, д. 51а, кабинет 111, 8 0232 36 22 20 | г. Гомель, ул. Ильича, д. 51а, 36 22 20 |
| 10 | для строительства и обслуживания торгового павильона с обособленным помещением для аптеки (для размещения объектов розничной торговли) | г. Гомель, ул. Ильича, 51а, каб. 111 Время начала приема заявлений: с 30.08.2016 по 30.09.2016 с 8.30 до 13.00 с 14.00 до 17.30 | 321083603601000300, площадь 0,0300 га, Гомельская обл., Гомельский район, Зябровский с/с, п. Коренёвка, ул. Октябрьская. Земельный участок не имеет ограничений (обременений) в использовании. Имеется возможность подключения электроснабжения, газоснабжения, водоснабжения, канализации. Имеется асфальтированный подъезд | аренда сроком на 49 лет | 2 851 рубль 84 копейки | 1304 рубля 85 копеек + расходы, связанные с опубликованием объявления | 285 рублей на р/с Гомельского райисполкома 3641414000270, филиала № 302 ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 151501664, УНП 400178549 | Землеустроительная служба Гомельского районного исполнительного комитета г. Гомель, ул. Ильича, д. 51а, кабинет 111, 8 0232 36 22 20 | г. Гомель, ул. Ильича, д. 51а, 36 22 20 |

Условия участия в аукционе.

Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный в извещении о проведении аукциона срок подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона, представляет документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка, а также заключает с местным исполнительным комитетом или по его поручению с организацией соглашение установленной формы.

Кроме того, в комиссию или организацию представляются:

- гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

- индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

- представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

- представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

- представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

